Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
1 САКАВІКА 2016 г. АЎТОРАК № 39 (28149) Кошт 2100 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Новы завод па... Канфуцыю
СТАР. 5



Нясвіж: вяртанне праз стагоддзе
СТАР. 8



Пінг-понг — гульня розуму?
СТАР. 15

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЦЕРАХАЎ, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі:**

*«Кошт жыллёва-камунальных паслуг у студзені падаражэў адразу па некалькіх прычынах: адбылося павелічэнне тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі, з паслугі «тэхнічнае абслугоўванне» былі вылучаны прыборка і асвятленне дапаможных памяшканняў (пад'ездаў). Акрамя таго, студзень быў халаднейшы за снежань на 9 градусаў, што адбілася на колькасці спажытай цеплавой энергіі. Пры гэтым магу сказаць, што мелі месца як неабгрунтаванае павышэнне кошту паслуг, так і тэхнічныя памылкі, якія будуць выпраўлены».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 1.03.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 21506,00 | ▲ |
| Еўра | 23550,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 283,33 | ▼ |
| Укр. грыўня | 791,75 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Свая справа

# ЗУБР-КАЧАЛКА, ГАДЗІННІК-АБЯРЭГ ДЫ «КАШУЛЬКА» НА ПАШПАРТ

### Карэспандэнты «Звязды» завіталі на «Млын» у пошуку крэатыву па-беларуску



Фота Надзеі БУЖАН.

На кірмашы вырабаў ручной работы ў выхадныя яблыку не было дзе ўпасці: пяцьсот майстроў з'ехаліся ў Мінск з усёй краіны, каб парадаваць тысячы пакупнікоў. Асабіста мяне ўсцешыла вялікая колькасць арыгінальных рэчаў з нацыянальным каларытам. Цацкі ў вышываных строях, ільняныя «кашулькі» для дакументаў, шляхетны керамічны сервіз з беларускімі сімваламі... СТАР. 9

■ Жыллё

## РАБІЦЬ СТАЎКУ НА ІПАТЭКУ

### І БОЛЬШ ДАПАМАГАЦЬ ТЫМ, ХТО ЖАДАЕ БУДАВАЦЦА Ў ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ ФАРМАЦЕ

А новыя нормы Указа №460 дазволяць сіротам атрымліваць ільготныя крэдыты на жыллё ўжо і без чаргі

**Яшчэ ў першай дэкадзе лютага ўрад краіны запатрабаваў ад усіх структур падрыхтаваць прапановы па «аптымізацыі крэдытавання дзяржаўных праграм». Асобна Міністэрству архітэктуры і будаўніцтва даручылі да 1 сакавіка распрацаваць альтэрнатыву льготным крэдытам. Таксама з першых дзён вясны ў сілу ўступаюць змены ў механізм ільготнага крэдытавання будаўніцтва жылля, якія зацверджаны Указам №460. Растлумачыць механізм навауўвядзенняў паспрабавалі начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мінбудархітэктуры Аляксандр ГОРВАЛЬ, начальнік аддзела юрыдычнай работы міністэрства ЖКГ Наталля КУХАРЧЫК і кансультант упраўлення жыллёвай палітыкі Мінбудархітэктуры Іна ПІНКОЎСКАЯ.** СТАР. 4



■ Сітуацыя

## КУДЫ ПАДЗЕЦЬ МАШЫНУ Ў ГОРАДЗЕ?

### Чаму перахопныя паркоўкі не сталі альтэрнатывай, як кантраляваць сродкі на аплату стаянкі і дзе ў Мінску пачнуць закрываць двары для аўто

**У сталіцы да 50% плошчаў, на якіх павінны захоўвацца транспартныя сродкі, не выкарыстоўваюцца для гэтага, паведаміў галоўны інжынер ДА «Гаражы, аўтастаянкі і паркоўкі» Пётр ПРУДНІКАЎ. На яго думку, уся справа тут у менталітэце гараджан: калі ёсць бясплатная альтэрнатыва, вядома, аўтаўладальнік скарыстаецца ёй.**

### НЕ ПЕРАХОПНЫЯ, ДЫК ПЛАТНЫЯ

Але такой альтэрнатывы ў сталіцы паступова будзе станавіцца ўсё менш. Ужо сёлета ў Мінску плануецца абсталяваць каля 8,4 тысячы платных паркавачных месцаў.

«Сёння ў Мінску налічваецца каля 1,6 тысячы платных месцаў для паркоўкі. Да канца года іх колькасць плануецца павялічыць да 10 тысяч. Яны з'явяцца ў межах другога транспартнага кальца», — сказаў Пётр Пруднікаў.

Па яго словах, за мяжой распрацоўкай дарожнай інфраструктуры займаюцца навукоўцы. А нашы інстытуты праектуюць яе без глыбокага навуковага падыходу.

«Напрыклад, Токіа па шчыльнасці насельніцтва і колькасці машын большы за Мінск. А затораў там не бывае і ўсе знаходзяць, дзе паставіць аўтамабіль», — разважае спецыяліст. СТАР. 4

# ФІНАНСЫ ПАРАДАК ЛЮБЯЦЬ

**Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклад аб праектах указаў па развіцці фінансавага рынку краіны. Кіраўнік дзяржавы палічыў неабходным запрасіць непасрэдных распрацоўшчыкаў гэтых нарматыўных прававых актаў, каб пачуць іх аргументы аб эфектыўнасці прапанаваных захадаў.**

У ліку вынесеных на разгляд дакументаў быў праект указа, які прадугледжвае перадачу Нацыянальнаму банку паўнамоцтваў па рэгуляванні страхавой дзейнасці і рынку каштоўных папер. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што па звестках, якія ён мае, гэтыя функцыі сёння паспяхова выконваюцца Міністэрствам фінансаў.

У сувязі з гэтым Прэзідэнт звярнуўся да прысутных з пытаннем аб мэтазгоднасці змен у сістэме, якая адладжана і нармальна функцыянуе. Праект указа атрымаў шырокае абмеркаванне. У выніку Прэзідэнт прыняў рашэнне адкласці на год пытанне з перадачай Нацбанку паўнамоцтваў па рэгуляванні страхавання і рынку каштоўных папер. Гэтыя функцыі пакуль застаюцца за Мінфінам. Разам з тым Нацбанк будзе надзелены паўнамоцтвамі кантролю ў гэтых сферах.

Акрамя таго, кіраўніку дзяржавы былі прадстаўлены праект указа аб працягу льготнага рэжыму падаткаабкладання даходаў ад аперацый з карпаратыўнымі аблігацыямі, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў абгрунтаваць неабходнасць падаўжэння льгот. Прэзідэнт задаўся пытаннем: ці не выйдзе так, што бюджэт недаатрымае пэўных сродкаў, і пацікавіўся, якая рэальная цана пытання і, галоўнае, — ці трапяць гэтыя грошы прадпрыемствам, ці аздаровяць сітуацыю на іх, ці павялічацца падатковыя паступленні ў казну? Заслухаўшы даклад па гэтым пытанні, Аляксандр Лукашэнка прыняў па ім станоўчае рашэнне. Льготны рэжым падаткаабкладання будзе падоўжаны на 2016-ы і 2017 гады.

Прэзідэнту таксама было дакладана аб праекце ўказа аб выпуску і абарачэнні акцый з выкарыстаннем замежных дэпазітарных распісак. Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў ацаніць існуючыя пры рэалізацыі прапанаваных захадаў рызыкі, пацікавіўся, што гэта дасць прадпрыемствам і краіне, ці ўзрасце прыток замежных інвестыцый. Праектам указа, як быў праінфармаваны Аляксандр Лукашэнка, агаворваецца права прадпрыемстваў выпускаць праз замежныя дэпазітарныя распіскі да 25% акцый. Эмітэнтам такіх распісак, як правіла, выступаюць буйныя банкі, кампаніі. Набываючы акцыі прадпрыемства, яны размяшчаюць іх на замежных фінансавых рынках. Такім чынам, праект дакумента накіраваны на прыцягненне замежных інвестыцый і выхаду акцый беларускіх акцыянерных таварыстваў на міжнародныя рынкі капіталу. Па выніках абмеркавання Прэзідэнт ухваліў праект гэтага ўказа.

■ Прыярытэты

Наталля КАЧАНАВА:

# «ГАЛОЎНАЕ — ГЭТА ЧАЛАВЕК, ЯГО ПАТРЭБЫ»

**Урад распрацаваў план рэалізацыі Указа №78 «Аб мерах па павышэнні эфектыўнасці сацыяльна-эканамічнага комплексу Рэспублікі Беларусь». Пра гэта паведаміла намеснік прэм'ер-міністра Наталля Качанава па выніках сустрэчы з кіраўніцтвам Мінгарвыканкама, паведамілі ў прэс-службе ўрада.**

«Указам №78 прадугледжана сацыяльная падтрымка грамадзян. Гэта, перш за ўсё, малазабяспечаныя, сем'і, што выхоўваюць дзяцей, пенсіянеры. Таму ўрадам распрацаваны план па рэалізацыі ўказа, — сказала Наталля Качанава. — Галоўнае — гэта чалавек, яго патрэбы. Пры рэалізацыі плана мерапрыемстваў акцэнт будзе зроблены на падтрымку малазабяспечаных людзей, тых, хто маюць патрэбу ў дапамозе».

Віцэ-прэм'ер звярнула ўвагу, што на падтрымку малазабяспечаных людзей будуць накіраваны сродкі. «Гэта дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога, таксама будзе павялічаны бюджэт пражытковага мінімуму, і, адпаведна, узрасцуць дапамогі, якія выплачваліся, зыходзячы з БПМ. Будзе аказана падтрымка па аплаце паслуг ЖКГ тым грамадзянам, якія будуць у гэтым мець патрэбу», — удакладніла намеснік прэм'ер-міністра, паведамляе БЕЛТА.

Адносна развіцця Мінска, яна адзначыла, што беларуская сталіца валодае вялікім патэнцыялам росту. Звярнуўшы ўвагу на адзін з пунктаў дакумента, які датычыцца скарачэння выдаткаў, Наталля Качанава заўважыла, што рэзервы ў гэтым кірунку ёсць. «Гэта тыя плошчы на прадпрыемствах і ў арганізацыях горада, якія неэфектыўна выкарыстоўваюцца, аптымізацыя структур, дублюючых функцый, якія ёсць у некаторых арганізацыях», — заўважыла віцэ-прэм'ер. «Каб прадпрыемства працавала эфектыўна, трэба ўважліва паглядзець, з чаго складаюцца выдаткі. Бо пры роўных умовах гаспадарання ёсць шмат прадпрыемстваў, якія працуюць паспяхова, з прыбыткам, рэнтабельна, выпускаюць запатрабаваную на ўнутраным і знешнім рынках прадукцыю. Гэта вельмі важна ў цяперашняй сітуацыі», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Яна таксама нагадала, што ацэньваць эфектыўнасць працы кіраўнікоў усіх узроўняў будуць, зыходзячы з вынікаў па прыцягненні прамых замежных інвестыцый, па рацыянальным імпартазамяшчэнні, росце і дыверсіфікацыі экспарту, а таксама стварэнні новых працоўных месцаў. «У Мінску ў 2016 годзе трэба стварыць 13,3 тыс. новых працоўных месцаў. Адно з заданняў, якое стаіць перад кіраўнікамі рэгіёнаў краіны, — гэта стварэнне працоўных месцаў, каб кожны жыхар меў права працаваць», — падкрэсліла віцэ-прэм'ер ■

■ Тры пытанні да ўлады

# БЫЛАЯ СЛАВА ВЯРТАЕЦЦА



Фота Васіля ЗЯНЬКО.

**Паўтара года таму Стаўбцоўскі раён узначаліў Юрый ГОРЛАЎ. Пра тое, што сітуацыя тут мяняецца да лепшага, сведчаць канкрэтныя паказчыкі. У Мінскай вобласці ўжо другі год ладзіцца спаборніцтва паміж раёнамі па тэмпах росту валавых аб'ёмаў сельскагаспадарчай прадукцыі. Па выніках 2014 года лепшым стаў Дзяржынскі раён, які атрымаў з абласнога бюджэту 200 млрд рублёў. Яшчэ столькі ж было размеркавана паміж 5 раёнамі, якія ўзначальваюць маладыя старшыні райвыканкамаў. У іх ліку і Стаўбцоўскі на чале з Юрыем Горлавым. З 28,5 млрд рублёў, якія дасталіся раёну, 17 млрд было ўкладзена ў сельскую гаспадарку, што стала значным падмуркам для павелічэння ўраджаяў і надояў. Не сакрэт, што і ў 2015-м раён на другім месцы — пасля Лагойскага. Падтрымка ў 100 млрд рублёў не будзе лішняй, зноў жа пойдзе на ўмацаванне сельскай гаспадаркі і будаўніцтва дзіцячага садка.**

***— Юрый Мікалаевіч, вашы папярэднікі, мяркую, таксама зрабілі нямала для раёна. Вы як чалавек новы, вядома, свежым вокам прыкмячалі недапрацоўкі, недахопы. З чаго пачыналі?***

— З усіх сфер дзейнасці, паколькі ўсе яны ўзаемазвязаныя. Але з улікам таго, што у нас прадукцыя сельскай гаспадаркі ў агульным аб'ёме займае больш як 50%, то асноўны ўпор быў зроблены менавіта на гэтую галіну. У мінулым годзе ўпершыню ў гісторыі Стаўбцоўскага раёна атрымалі ўраджайнасць збожжавых і зернебабовых 41,9 цэнтнера з гектара і надаілі 83 тыс. тон малака, а яго таварнасць самая высокая на Міншчыне — 91,3%.

Мы мадэрнізавалі і ўзвялі некалькі вытворчых памяшканняў для ўтрымання буйной рагатай жывёлы, на 1300 павялічылі пагалоўе кароў, шмат папрацавалі над паляпшэннем кармавой базы, толькі летась пабудавалі 43 сянажна-сіласныя траншэі. Сёлета гэтую работу завяршым: засталіся апошнія штрыхі. З уводам іх у дзеянне вырашым пытанне захавання кармоў і будзем займацца іншымі перспектыўнымі праектамі.

Што тычыцца непасрэдна мадэрнізацыі, то ў кожным канкрэтным выпадку да яе падыходзім індывідуальна. На мой погляд, не трэба імкнуцца мадэрнізаваць усе малочнатаварныя фермы пад даільную залу, установку робатаў. Малакаправод таксама забяспечвае нармальныя даенне, і гэтая тэхналогія мае права на жыццё, там, дзе яна апраўдана. У нас, зрэшты, як і ўсюды, адчуваецца дэфіцыт спецыялістаў сельскагаспадарчага профілю, у прыватнасці, у заатэхніі і ветэрынарыі. Для пераводу працэсу на сучасныя тэхналогіі патрэбны кваліфікаваныя спецыялісты. Там жа, дзе іх не хапае, варта падумаць ці трэба гэта рабіць.

У мінулым годзе Стаўбцоўскі мясакансервавы камбінат, які быў філіялам Мінскага мясакамбіната, стаў самастойнай юрыдычнай адзінкай. Гэтая акалічнасць прынесла толькі пазітыўнае. Сёлета тут плануюць атрымаць больш як 45 млрд рублёў прыбытку. Наогул, прадпрыемствы займае ў агульным аб'ёме прамысловай прадукцыі раёна больш як 50%. І гэта з улікам таго, што на тэрыторыі раёна працуюць і іншыя буйныя прадпрыемствы.

У раёне робіцца стаўка не толькі на дзяржаўныя прадпрыемствы. Развіваюцца і прыватныя формы ўласнасці. У прыватнасці, завод «Фрэор Рэфрыгерайшн» створаны з удзелам замежнага партнёра. Тут выпускаецца халадзільнае абсталяванне пад канкрэтны заказ. Прадукцыя пастаўляецца пераважна за мяжу, аднак і заяўкі айчынных спажыўцоў не застаюцца без увагі. Увод у дзеянне новага цэха дазволіць выпрацоўваць да 600 адзінак абсталявання.

Удзельная вага сялянска-фермерскіх гаспадарак у падатковых паступленнях у раённы бюджэт пакуль невялікая. Але робім стаўку на інтэнсіўнае развіццё такіх гаспадарак. Разумеем, што гэта новыя рабочыя месцы, заробак для нашых людзей. У СФГ «Сула», напрыклад, сярэдняя зарплата каля 7 млн рублёў, сур'ёзныя планы па мадэрнізацыі вытворчасці, новым будаўніцтве, што дазволіць прыцягнуць інвестыцыі, рэалізоўваць прадукт за мяжу, а ў краіну будзе паступаць валютная выручка. Наогул, мы ідзём шляхам аптымізацыі вытворчасці для таго, каб знізіць сабекошт прадукцыі, павысіць узровень заработнай платы. Летась рэарганізавалі ПМК-74. Гэтая арганізацыя павінна займацца непасрэдна сваёй справай — асушэннем зямель. Таму сельскагаспадарчыя ўгоддзі, што ёй належалі, перадалі наваствoранаму на базе дзвюх арганізацый ААТ «Налібокі-Агра». У выніку аптымізацыі колькасць работнікаў са 124 скарацілася да 90. Але людзей на вуліцы не пакідаем, абавязкова прапануём працу на тых участках, падраздзяленнях, дзе патрэбны рабочыя рукі, ёсць вакансіі.

***— Юрый Мікалаевіч, якім вы бачыце горад гадоў праз 15?***

— Канешне, за гэты час Стоўбцы стануць іншым горадам, больш утульным, камфортным для пражывання. Нядаўна распрацаваны стратэгічны план развіцця горада да 2030 года, які прадугледжвае шмат новых аб'ектаў, пазітыўныя змены. Пры яго рэалізацыі ў многім спадзяёмся на свой бюджэт, будзем усё рабіць паступова, паэтапна, зыходзячы з фінансавых магчымасцяў. У прыватнасці, нашы жыхары наракаюць на адсутнасць у горадзе плошчы. Вызначылі пад яе пляцоўку, выставілі на аўкцыён. Плануецца, што побач размесціцца гандлёва-забаўляльны цэнтр, які таксама вельмі патрэбны гораду.

У мінулым годзе здалі ў эксплуатацыю фізкультурна-аздараўленчы комплекс. Ён будаваўся на працягу сямі гадоў — доўгачаканы праект не толькі для горада, але і раёна. Сёння комплекс карыстаецца попытам, тут пастаянна заняты басейн, ствараюцца спартыўныя секцыі.

Летась увялі ў дзеянне 21 тыс. квадратных метраў жылля пры плане 18 тыс. квадратаў. У асноўным за кошт індывідуальнага сектара. У мікрараёне «Паўночны-2» для будаўніцтва адвялі 500 зямельных участкаў. Прадаём іх з аўкцыёну, выдзяляем тым, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, шматдзетным сем'ям. У мінулым годзе засялілі новы шматкватэрны дом, плошчай 3,1 тыс. квадратных метраў у райцэнтры. Сёлета пачалі ўзвядзенне яшчэ аднаго, пабудавалі 6 шматкватэрных дамоў у сельскай мясцовасці.

Хутка пачнецца будаўніцтва новага дзіцячага сада на 230 месцаў, які мяркуецца засяліць малымі навасёламі да 1 верасня 2017-га. У Стоўбцах сем дзіцячых дашкольных установ, але яны перапоўненыя. Часткова яго ўзвядзенне будзе фінансавацца за кошт раённага бюджэту. Актуальнае ў горадзе і будаўніцтва школы, мяркуецца, што новая навучальная ўстанова на 720 месцаў з'явіцца да 2020 года.

***— І ўсё-такі як будзе будавацца горад: ушчыльняцца ці пашыраць свае межы?***

— У той частцы, што вядзе да маторнага завода, плануем пабудаваць каля 14 жылых дамоў. У гістарычнай частцы горада, дзе працякае Нёман, з'явіцца набярэжная. У горадзе няма парку адпачынку, а жыхары вельмі спадзяюцца, што ён з'явіцца. Мы вызначылі месца, дзе яго можна разбіць. Словам, планаў шмат. У тым ліку і далейшае добраўпарадкаванне тэрыторыі горада.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

*lazovskaya@zviazda.by* ■

■ Ёсць праблема

# ПЕРАПРАЦОЎКА ПАТРЭБНАЯ. А ЧЫМ СІЛКАВАЦЬ?

**Будаваць завод па перапрацоўцы аджыўшых сваё акумулятараў і батарэек у Беларусі пакуль не плануецца.**

Пра гэта расказаў **начальнік упраўлення дзяржаўнай экалагічнай экспертызы Міністэрства прыроды і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ШАХЭМІРАЎ.** Па словах эксперта, для будаўніцтва падобнага прадпрыемства трэба спачатку ацаніць аб'ёмы яго загружанасці. Каб работа завода была рэнтабельнай, трэба штогод збіраць не менш як 30 тысяч тон электронных элементаў сілкавання. Для Беларусі гэта лічба завялікая.

— Складанасці з утылізацыяй батарэек у нас існуюць, — зазначыў спецыяліст. — Раней мы працавалі з калегамі з Польшчы і Расіі, але з-за праблем рознага кшталту ўсё змянілася. Напрыклад, польскі бок патрабуе ад нас пэўных фізічных характарыстык: элементы сілкавання павінны быць без выдзяленняў электраліту, і іншае. У сваю чаргу, расійскія прадпрыемствы, з якімі мы працавалі, трапляюць у крымінальныя хронікі. Таму мы ўсё ж такі схіляемся да таго, каб у нас быў свой аб'ект невялікай магутнасці.



Па словах Андрэя Шахэмірава, у Беларусі хапае навуковых даследаванняў у сферы ўтылізацыі такіх адходаў, аднак вартасць і бяспеку распрацовак яшчэ трэба будзе ацаніць.

Аналагічная праблема складваецца і па пытанні перапрацоўкі небяспечных адходаў, такіх як пестыцыды. У Гомельскай вобласці існуе ўнікальны для постсавецкай прасторы комплекс па перапрацоўцы і захаванні таксічных адходаў прамысловасці, такія прадпрыемствы раней планавалі пабудаваць у кожнай саюзнай рэспубліцы.

— Галоўная праблема якраз з нейтралізацыяй пестыцыдаў, — распавёў **старшыня Савета Беларускага грамадскага аб'яднання «Экалагічная ініцыятыва» Юрый САЛАЎЁЎ.** — Кошт пабудовы комплексу для гэтых мэт вагаецца паміж 50 і 60 мільёнамі еўра. Але ў Беларусі захоўваецца прыкладна 15-20 тысяч тон пестыцыдаў, гэтага мала. Рэнтабельным прадпрыемства будзе пры аб'ёмах у 35-40 тысяч тон за год. Таму зараз мы разглядаем магчымасць прыцягнення да будаўніцтва замежных інвестараў, каб комплекс у Гомелі меў статус рэгіянальнага.

Зацікаўленыя інвестары, у сваю чаргу, сутыкаюцца з заканадаўчымі абмежаваннямі — трансгранічнае перамяшчэнне пестыцыдаў забаронена нават у межах Мытнага саюза, таму прывозіць у Беларусь адходы з Расіі ці Казахстана для ўтылізацыі не атрымаецца. Тым не менш зацікаўленасць у праекце з боку інвестараў ёсць. У прыватнасці, адна з найбуйнейшых у свеце кампаній па ўтылізацыі смецця — Veolia — гатова ўкласці грошы ў яго рэалізацыю. Вядуцца перамовы з кампаніямі Аўстрыі і Славеніі.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

*lyskavets@zviazda.by* ■

# Вясна пачнецца з моцнага цыклону «Зісі»

## У аўторак і сераду ён прынясе нам моцныя ападкі, шквалісты вецер і нават снежныя заносы

**Ужо сёння гэты паўднёвы цыклон «падорыць» нам складаныя ўмовы надвор'я, а спецыялісты аб'явяць штармавое папярэджанне, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Такім чынам, у аўторак раніцай і ўдзень пройдуць працяглыя ападкі (снег, мокры снег, дождж), у многіх раёнах — моцныя ападкі, па паўночным захадзе магчымы мяцеліца і снежныя заносы. Больш за тое, па поўначы Беларусі прагназуецца наліпанне мокрага снегу, галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с. Максімальная тэмпература паветра складзе ад мінус 2 градусаў па поўначы да плюс 5 па поўдні краіны.

Сур'ёзныя ападкі чакаюцца і ў сераду. Гэта будзе снег, мокры снег, па ўсходзе з дажджом, уначы месцамі па паўночным усходзе — моцныя ападкі і слабы галалёд. У некаторых раёнах магчымае наліпанне мокрага снегу, на дарогах захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак у сераду складзе ад мінус 3 градусаў да 4 цяпла, па паўднёвым усходзе — да плюс 6 градусаў.

Потым гэты цыклон будзе рухацца далей у бок Расіі, а ў Беларусі ўсталюецца больш спакойнае надвор'е. Таму кароткачасовыя ападкі (мокры снег і дождж) у чацвер чакаюцца толькі месцамі. У некаторых раёнах магчымы туман, слабы галалёд. Уначы і раніцай на асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 да плюс 2 градусаў, а ўдзень — ад нуля да 7 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пятніцу і суботу месцамі чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу, часам слабы туман і галалёд. Уначы і раніцай на асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 4 градусаў. Удзень прагназуецца ад нуля да 5 цяпла, па паўднёвым захадзе чакаецца да плюс 8 градусаў. Далейшае павялічэнне тэмпературы чакаецца ўжо ў нядзелю, калі прагназуецца нават да 10 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*



# Стаўка на IT і адпраўленні без канвертаў

**На вытворчасці «Мінская пошта» ўвагу сёлета ўдзеляць удасканаленню існуючых і прасоўванню новых паслуг і сэрвісаў, заснаваных на сучасных інфармацыйных тэхналогіях, паведаміла намеснік начальніка вытворчасці па прасоўванні паслуг і продажах Алена ТРУБАЧ.**

Напрыклад, інтэрнэт-сэрвіс «Віншаванні са святамі»: любы ахвотны можа аформіць заказ на віншавальны ліст да родных, сяброў або партнёраў да свят. Ліст з пажаданнямі на прыгожым бланку ў канверце будзе дастаўлены адрасату не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі.

Плануецца ўкараненне паслугі па вырабе бесканвертных адпраўленняў. Гэта бланк у выглядзе ліста і канверта адначасова. На адным баку бланка друкуюцца паштовыя дадзеныя, усярэдзіне — персанальныя. Каб адкрыць бесканвертнае адпраўленне, дастаткова адарваць праклееныя бакавыя часткі па лініях перфарацыі. Такімі адпраўленнямі можна рассылаць рэкламныя матэрыялы і дакументы.

Для кліентаў, якія карыстаюцца паслугай унутранай паскоранай пошты, будуць прадстаўлены новыя сэрвісы: EMS-адпраўка на працягу 3—4 гадзін у межах Мінска, а таксама адпраўленні «МАХ».

У планах прадпрыемства — укараненне сэрвісу «Мясцовая рассылка» ў рамках паслугі бязадрасная «Прамая паштовая рэклама». Паслуга арыентавана на малы і сярэдні бізнес, калі прасоўванне паслуг неабходна ажыццяўляць у рамках адной вуліцы ці аднаго раёна горада.

Плануецца адкрыццё аддзялення паштовай сувязі-58 па адрасе вул. Налібоцкая, д. 36 (гандлёвы цэнтр «Квадра») і аддзялення паштовай сувязі-62 (мікраён «Лебядзіны»). Таксама ў сувязі з развіццём паштовай інтэрнэт-крамы shop.belpost.by з 10 лютага ў пасылачнай зале цэха па прадастаўленні паслуг адкрыты гандлёва-выставачны аб'ект «Паштовы пасаж» па рэалізацыі тавараў беларускіх вытворцаў.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.** *seradzyuk@zviazda.by*



Фота БЕЛТА.

# «БАЗАР»: ТОЕ, ЧАГО РАНЕЙ НЕ БЫЛО

**Адзін з самых вядомых фестываляў на постсавецкай прасторы — XXV міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» — пройдзе з 14 па 18 ліпеня, а ў яго дзіцячым конкурсе адбудуцца змены: краіны-заснавальніцы (Беларусь, Расію і Украіну) прадставяць толькі па адным маленькім вакалісце або вакалістцы (раней мелі магчымасць выступіць адразу двое).**




Пра гэта паведаміла дырэкцыя фестывалю. Што датычыцца праграмы, то ўжо вядома, што на юбілейным «базары» адбудуцца сольныя канцэрты Сяргея Лазарава, Крысціны Арбакайтэ, Валерыя Лявонцьева, Дзіяны Арбеніной і групы «Начныя снайперы», Максіма Галкіна. У якасці ганаровай госці на канцэрце Максіма чакаюць Алу Пугачову. Пасля доўгай адсутнасці на фестывалі выступіць Аляксандр Разенбаум.

Безумоўна, з размахам адсвяткуюць 75-ю гадавіну з дня нараджэння народнага артыста СССР Уладзіміра Мулявіна. Запланаваны правядзенне выстаўкі, тэатральная пастаноўка, спецыяльны канцэрт. Асобна Майстра згадаюць на канцэртах адкрыцця і, магчыма, закрыцця фестывалю.

Квіткі на самыя, на погляд арганізатараў, запатрабаваныя публікай канцэрты ў Летнім амфітэатры ўжо прадаюцца з 26 лютага. А з 25 сакавіка можна будзе набыць квіткі на астатнія праекты, якія пройдуць на галоўнай канцэртнай пляцоўцы «базару». Трэці этап — рэалізацыя квіткоў культурных падзей на іншых фестывальных пляцоўках (пра канкрэтную дату ў дырэкцыі паведамяць дадаткова). Квіткі можна набыць з любога пункта свету праз сістэмы рэалізацыі www.ticketpro.by, www.kvitki.by.

**Кіраўнік дырэкцыі, прэзідэнт Сусветнай асацыяцыі фестываляў (WAF) Аляксандр СІДАРЭНКА** паведаміў, што наконт квіткоў на «Славянскі базар» яму ўжо тэлефанавалі з Польшчы і Германіі.

Ранні продаж квіткоў дазволіць дырэкцыі акумуляваць фінансы, каб больш свабодна працаваць пры заключэнні дагавораў, выплаце авансаў і планаванні. Леташні вопыт быў удалым, лічыць Аляксандр Сідарэнка.

Сёлета плануецца пашырыць геаграфію ўдзельнікаў «базару». На вулічных падворках, дзе можна перакусіць, купіць сувеніры, тавары, убачыць выступленні самадзейных артыстаў, будуць прадстаўлены не толькі раёны Віцебшчыны, але і іншыя рэгіёны краіны.

Фестываль вулічнага мастацтва «На сямі вятрах», прэзентаваны летась, атрымае развіццё. Аляксандр Сідарэнка ўпэўнены, што цягам часу «На сямі вятрах» ператворыцца ў самастойны культурны праект. А пакуль што стане больш фестывальных пляцовак пад адкрытым небам. Адбудуцца тэатральнае шэсце-перформанс і грандыёзная пастаноўка ў дэкарацыях начнога горада. Мінакі не толькі ўбачаць, але і змогуць узяць удзел у інтэрактыўных праектах тэатраў, музыкантаў, арганізатараў перформансаў.

**Квіткі на самыя, на погляд арганізатараў, запатрабаваныя публікай канцэрты ў Летнім амфітэатры ўжо прадаюцца з 26 лютага.**

Нюансы праекта «Лялечны квартал» пакуль не раскрываюцца. Вядуцца перамовы з замежнымі лялечнікамі, якія мараць прыехаць у Віцебск. Дакладна вядома толькі, што, як і раней, «сталіцай царства дзяцінства» стане Беларускі тэатр «Лялька».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

***P.S.** За першыя чатыры дні на 11 канцэртаў, квіткі на якія паступілі ў продаж, набылі і забраніравалі ўжо больш за 30% месцаў. Самы першы квіток быў набыты праз інтэрнэт на канцэрт Сяргея Лазарава, які сёлета выступіць за Расію на Еўрабачанні. «Хоць звыклай да нядаўняга часу чаргі ў касах няма, аднак пастаянна ёсць кліенты. Пры гэтым шмат калектыўных заявак. Напрыклад, нямала жадаючых убачыць і пачуць артыстаў з фанклубаў розных гарадоў Сяргея Лазарава і Валерыя Лявонцьева», — дадаюць у Дырэкцыі фестывалю.*

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## УМОВЫ НАДВОР'Я — НА КАРЫСЦЬ РЫБЕ

**Параўнальны аналіз асноўных вынікаў работы Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь за студзень гэтага года з аналагічным перыядам мінулага паказаў тэндэнцыю да значнага зніжэння колькасці выпадкаў браканьерства з дапамогай сетак.**

Калі за студзень 2015 года дзяржінспектары канфіскавалі 163 сеткі агульнай даўжынёй 18 кіламетраў, дык за першы месяц гэтага года — 110 сетак (мінус 33 працэнты) агульнай даўжынёй 5 кіламетраў (мінус 70 працэнтаў).

— Перш за ўсё гэта абумоўлена розніцай у кліматычных умовах цяперашняй зімы і мінулай. Сёлета, у адрозненне ад леташняга сезона, дзякуючы моцным і ўстойлівым маразам вадаёмы і вадацёкі рана пакрыліся лёдам. З-за ледаставу здабыча рыбы сеткамі была моцна абцяжарана, — расказала **прэс-сакратар Дзяржінспекцыі Вольга ГРАМОВІЧ.** — Пры гэтым адсутнічала ўсякая маскіроўка як самога парушальніка, так і ўсталяваных ім прылады лоўлі. Да таго ж натаптаны на лёдзе і берагах снег — так званая «белая сцежка» — дапамагае хутчэй вылічыць браканьера.

Гэтыя абставіны, несумненна, улічваюцца «аматарамі» лоўлі сеткамі, якія асцерагаюцца адказнасці за здзейсненыя імі правапарушэнні. Разам з тым станоўчы вынік таксама з'яўляецца вынікам пастаяннай прафілактычнай і растлумачальнай працы дзяржінспектараў.

## НОВЫ НАРМАТЫЎ НА ГАНДЛЁВЫЯ ПЛОШЧЫ

**У краіне зменены парадак вызначэння нарматыву забяспечанасці насельніцтва гандлёвымі плошчамі.**



Уступіла ў сілу пастанова Міністэрства гандлю ад 1 лютага 2016 года №5 «Аб унясенні змяненняў у Інструкцыю па ацэнцы выканання нарматываў дзяржаўных сацыяльных стандартаў у галіне гандлю і грамадскага харчавання», якой зменены парадак ацэнкі выканання нарматываў дзяржаўных сацыяльных стандартаў у галіне гандлю.

Цяпер пры вызначэнні нарматыву забяспечанасці насельніцтва гандлёвымі плошчамі замест формаў статыстычнай справаздачнасці будуць выкарыстоўвацца звесткі, якія змяшчаюцца ў Гандлёвым рэестры Рэспублікі Беларусь аб гандлёвых плошчах крамаў і павільёнаў, а таксама аб плошчах гандлёвых цэнтраў, адведзеных пад гандлёвыя аб'екты.

Унясенне гэтых змяненняў дазволіць аператыўна атрымліваць больш дакладныя дадзеныя пры ацэнцы выканання нарматыву дзяржаўнага сацыяльнага стандарту.

## 8 САКАВІКА — ПА ГРАФІКУ НЯДЗЕЛІ

**Дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс» абвясціла, як будзе арганізавана работа прыгарадных і міжгародніх аўтобусных маршрутаў у сувязі з пераносам працоўных дзён у пачатку сакавіка.**

Так, у перыяд з 4 па 8 сакавіка тым, хто збіраецца ў дарогу, трэба мець на ўвазе, што курсіраваць прыгарадныя і міжгароднія аўтобусы будуць: 4 сакавіка — па раскладзе чацвярга, 5 сакавіка — па раскладзе пятніцы, 6 сакавіка — суботы, 8 сакавіка — нядзелі. 7 сакавіка работа прыгарадных маршрутаў запланавана па графіку нядзелі, а прыгарадных — па графіку буднага дня, серады.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

# РАБІЦЬ СТАЎКУ НА ІПАТЭКУ



### Заданне паменшылі да 4 млн «квадратаў»

Адразу Аляксандр Горваль нагадаў, што летась у краіне было пабудавана 5 млн 54,6 тысячы квадратных метраў жылля, што складае 126,4% да гадавога задання. Не выканана заданне толькі Гродзенскай вобласцю (96,8%). Пры гэтым аб'ём ільготных крэдытаў на будаўніцтва жылля ў параўнанні з 2014 годам скараціўся на 40% — з 10,9 трлн да 7,3 трлн рублёў. Увод у эксплуатацыю жылля для грамадзян з дзяржпадтрымкай склаў 1млн 610,2 тысячы квадратных метраў.

Палітыка міністэрства па ўтрыманні кошту будаўніцтва ў 2015 годзе дазволіла атрымаць індэкс будаўніча-мантажных работ на ўзроўні 102,9% (прагнозны індэкс Мінэканомікі — 108,7%) пры індэксе спажывецкіх цэн 113,5%. Гэта сур'ёзны паказчык, аднак...

Аб'ёмы дзяржаўнай падтрымкі на гэты год яшчэ скарацілі (да 4,8 трлн рублёў), таму было зменшана і заданне на 2016-ты да 4 млн квадратных метраў жылля. Вынікі першых двух месяцаў года паказваюць нядрэнныя тэмпы — было пабудавана 643 тысячы квадратных метраў, што складае 16,5% ад гадавога задання.

Больш за ўсё жылля прагназуецца ўзвесці ў Мінскай вобласці — 1,1 млн «квадратаў». Жылыя дамы (кватэры), агульная плошча якіх складзе 191,2 тысячы квадратных метраў, плануецца пабудаваць для 2194 шматдзетных сем'яў. Па лініі арэнднага жылля сёлета плануецца пабудаваць 127,2 тысячы квадратных метраў. Дарэчы, большую долю арэнднага жылля пабудуюць у Гродзенскай вобласці — 53 тысячы «квадратаў», а ў Мінску ўзвядзенне жылых дамоў (кватэр) для прадастаўлення жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання не прадугледжана ўвогуле.

Будаўніцтва жылых дамоў у гарадах-спадарожніках будзе весціся ў Жабінцы (Брэсцкая вобласць) і Скідзелі (Гродзенская вобласць) — усяго для 241 грамадзяніна.

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

### Аб'ём дзяржпраграмы на пяцігодку залежыць ад рэсурсаў

Аляксандр Горваль адзначыў, што спецыялістамі цяпер дапрацоўваецца дзяржаўная праграма жыллёвага будаўніцтва на 2016—2020 гады. Чакаецца, што гэты дакумент будзе складацца з дзвюх падпраграм, якія тычацца непасрэдна ўласна жыллёвага будаўніцтва і будаўніцтва інфраструктуры для жылля.

Паводле слоў Аляксандра Горваля, праграма прадугледжвае, што да 2020 года ў краіне будзе будавацца не менш як 3,5-4 млн квадратных метраў жылля штогод. Пры наяўнасці большага аб'ёму льготных крэдытных рэсурсаў і пашырэнні іншых формаў дзяржаўнай падтрымкі аб'ём будаўніцтва жылля, у тым ліку з дзяржпадтрымкай, можа павялічвацца. А яшчэ ў дзяржпраграме будуць улічвацца бягучая эканамічная сітуацыя і прагнозы адносна яе далейшага развіцця. «Дакументы прапрацоўваюцца досыць падрабязна, хоць ва ўмовах ваганняў фінансавага рынку гэта зрабіць цяжка», — заўважыў Аляксандр Горваль.

Асаблівую ўвагу ў дзяржпраграме нададуць будаўніцтву энергаэфектыўнага жылля. Цяпер ставіцца задача па пераходу на 100-працэнтнае будаўніцтва шматкватэрнага жылля ў энергаэфектыўным фармаце ўжо да канца гэтай пяцігодкі. «Што тычыцца індывідуальнага будаўніцтва, то для іх гэта не будзе абавязковым патрабаваннем — толькі па жаданні», — растлумачыў начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі.

### Замест ільготных крэдытаў — ліквідныя ўчасткі і танныя будматэрыялы

Аляксандр Горваль нагадаў, што ў нашай краіне ўжо ёсць закон аб іпатэцы (класічная сістэма, якая дзейнічае ва ўсім свеце), функцыянуе праграма па жыллёвых зберажэннях, якую прапануе адзін з буйных банкаў краіны, у зачаткавых умовах ёсць лізінг. «Усё гэта існуе ў Беларусі, але ёсць праблема высокіх працэнтных ставак па крэдытах, высокай стаўкі рэфінансавання, а гэта не дазваляе выкарыстоўваць падобныя механізмы ў шырокім маштабе», — лічыць спецыяліст.

Ёсць і дадатковыя прапановы, якія цяпер разглядаюцца на стадыі абмеркавання. Напрыклад, гаворка ідзе аб выдзяленні дастатковай колькасці зямельных участкаў у запатрабаваных месцах. Менавіта цікавых участкаў, а не тых, што нярэдка прапануюцца людзям сёння. Пры наяўнасці ўчасткаў узнікае пытанне аб даступных будматэрыялах. Начальнік упраўлення нагадаў, што ў свой час былі льготныя ўмовы па прадастаўленні драўніны на будаўніцтва жылля. Цяпер Мінбудархітэктуры прапануе вярнуцца да разгляду такога пытання. Гэта ж тычыцца і іншых айчынных матэрыялаў: гравію, пяску і гліны. Рэальна прадаваць іх на ўнутраным рынку амаль па сабекошце, лічыць эксперт.

**Паніжальны каэфіцыент на арэнднае жыллё з 1 сакавіка будзе прымяняцца толькі на плошчу да 20 квадратных метраў жылля ў разліку на члена сям'і.**

Сярод мер, якія разглядаліся, таксама зніжэнне нагрузкі на забудоўшчыкаў у буйных гарадах, што дапамагло б зрабіць таннейшым будаўніцтва жылля для чаргавікоў. А для індывідуальных забудоўшчыкаў існуе варыянт па прапанове растэрміноўцы пры куплі будматэрыялаў. Умацаваць кантроль дзяржавы за коштам асноўных айчынных будматэрыялаў на ўзроўні нарматыўных актаў і іншыя.

### Сацыяльнае жыллё на 5 гадоў плюс права на льготны крэдыт

Указам №460 у сакавіку пашырана права дзяцей-сірот на атрыманне льготных крэдытаў на будаўніцтва, рэканструкцыю ці набыццё жылля, тлумачыць кансультант упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Іна Пінкоўская.

Раней дзеці-сіроты таксама маглі атрымаць ільготны крэдыт (на 20 гадоў пад 5% гадавых), але дзяржпадтрымка прадастаўлялася ў парадку агульнай чаргі. З 1 сакавіка яны будуць мець права атрымліваць ільготныя крэдыты і субсідыі ў пазачарговым парадку.

А яшчэ цяпер ільготны крэдыт сіротам будзе прадастаўляцца на 40 гадоў пад 1%. Праўда, сацыяльнае жыллё яны будуць атрымліваць толькі на 5 гадоў, а пасля заканчэння тэтага тэрміну можна застацца жыць у кватэры, але яна будзе пераведзена ў катэгорыю арэнднага жылля. Паводле інфармацыі спадарыні Пінкоўскай, пад норму гэтага ўказа падпадаюць каля 12 тысяч сірот у краіне.

Акрамя таго, з уступленнем у сілу ўказа права на першачарговае крэдытаванне пазбаўляюцца грамадзяне, якія пражылі ў інтэрнатах больш за 10 гадоў. З інтэрнатамі пытанне ўвогуле асобнае.

### Камерцыйнае жыллё — толькі тым, у каго нічога няма

Начальнік аддзела юрыдычнай працы і кадраў Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Наталля Кухарчык патлумачыла, што ўказам №460 таксама прадугледжана магчымасць перавесці інтэрнаты ў арэнднае жыллё кватэрнага тыпу, якое можна будзе прыватызаваць. Пры гэтым права на прыватызацыю будуць мець не ўсе катэгорыі грамадзян.

У сістэме камерцыйнага жылля для першачаргавікоў (грамадзян, якія атрымалі жыллё на перыяд працаўладкавання — маладых спецыялістаў, ваеннаслужачых, суддзяў і іншых) «падрэзалі» льготы. Для іх паніжальны каэфіцыент на арэнднае жыллё з 1 сакавіка будзе прымяняцца толькі на плошчу да 20 квадратных метраў жылля ў разліку на члена сям'і. А калі ва ўласнасці ў першачаргавікоў з'явіцца іншае жыллё, то яны будуць выселены з арэнднай кватэры.

Яшчэ адно змяненне звязана з парадкам акумулявання сродкаў, якія паступаюць у якасці платы за арэнднае жыллё. Аблвыканкамы і Мінгарвыканкам будуць збіраць гэтыя сродкі на сваіх рахунках і самастойна імі распараджацца.

Некалькі слоў спадарыня Кухарчык сказала і пра завяршэнне прыватызацыі дзяржаўнага жыллёвага фонду. Так, сёння ў Беларусі існуе прыкладна 35,6 тысячы кватэр арэнднага жылля. А па стане на пачатак вясны ў краіне застаецца каля 200 тысяч непрыватызаваных кватэр. Пасля першых дзён ліпеня такое жыллё будзе пераведзена ў разрад камерцыйнага. Аднак нават і пасля гэтай даты жыхары падобных кватэр змогуць прыватызаваць гэтае жыллё яшчэ на працягу года, лічыць Наталля Кухарчык. Справа ў тым, што жылец такога жылля можа падаць адпаведную заяву на прыватызацыю ў жыллёвы аддзел у апошнія дні чэрвеня. Далей працэс прыватызацыі можа зацягнуцца нават на цэлы год.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# КУДЫ ПАДЗЕЦЬ МАШЫНУ Ў ГОРАДЗЕ?

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Па яго словах, за мяжой распрацоўкай дарожнай інфраструктуры займаюцца навукоўцы. А нашы інстытуты праектуюць яе без глыбокага навуковага падыходу.

«Напрыклад, Токіа па шчыльнасці насельніцтва і колькасці машын больш за Мінск. А затораў там не бывае, і ўсе знаходзяць, дзе паставіць аўтамабіль», — разважае спецыяліст.

Па яго словах, у сталічным горадабудаўніцтве не прадугледзелі, што на сённяшні дзень колькасць аўто на 1000 мінчан дасягнула 416, у той час як паводле Генплана 2030 год гэтая лічба складае 380.



У той жа час усе разумеюць, што праблема паркоўкі ў горадзе пакуль што безальтэрнатыўная. Таму да аўтамабілістаў, якія парушаюць правілы паркоўкі, жорсткіх захадаў не прымаюць.

«Мы чалавека выганім з гэтага месца, але для таго, каб прыпаркаваць машыну па правілах, месца няма. Атрымліваецца, мы з аднаго парушэння адправім яго на другое парушэнне», — зазначыў Пётр Пруднікаў.

Летась у горадзе спрабавалі працаваць з так званымі перахопнымі паркоўкамі. Гэта такія інжынерныя комплексы, якія прадастаўляюць паслугі руху па тэрыторыі лепшыя, чым на ўласным аўтамабілі. Іх сэнс у тым, што чалавек пакідае на іх машыну, а далей яму зручна адпраўляцца па сваіх справах на грамадскім транспарце. Тарыф на такіх паркоўках з 8 да 24 гадзін складае ўсяго 500 рублёў за гадзіну. Аднак мінскі досвед паказаў, што ў сярэднім перахопнымі паркоўкамі карыстаюцца толькі два чалавекі на тыдзень.

Што да платных паркоўак, то летась у Мінску была запушчана сістэма безнаяўнай аплаты. Такім чынам, сёння можна заплаціць рознымі спосабамі: праз сістэму АРІП, SMS-паведамленні, пры дапамозе пластыкавай карткі альбо гатоўкай. Апошні спосаб будзе выкарыстоўвацца яшчэ некалькі гадоў, затым сістэма аплаты стане цалкам безнаяўнай. Летась аўтааматары заплацілі за паркоўку ў Мінску больш за 15,7 млрд рублёў. У асноўным грамадзяне выкарыстоўвалі безнаяўны разлік. Адметна, што для абсталявання платных паркоўак было затрачана шэсць мільярдаў рублёў, такім чынам, гарадскі бюджэт атрымаў дзевяць мільярдаў з 1600 машынамесцаў.

### УСЁ ПРАЗРЫСТА

На думку Пятра Пруднікава, сродкі ад аплаты за паркоўку павінны выкарыстоўвацца празрыста. Для таго, каб мінчане маглі даведацца, на што ідуць іх грошы, сабраныя за платную паркоўку, ствараецца спецыяльны сэрвіс на сайце *parkouka.by*. Пакуль што ён дазваляе кіроўцам кантраляваць, ці не трапілі яны ў спіс даўжнікоў за стаянку. Але неўзабаве сэрвіс пашырыцца.

«Можна будзе ўбачыць, што сродкі накіраваны на абсталяванне дзіцячай пляцоўкі, дадатковых паркавачных месцаў або рамонт дарогі. Таксама на сайце мы спрабуем зрабіць карту Мінска са стаянкамі, дзе можна «клікнуць» і ўбачыць адрас стаянкі, колькасць свабодных месцаў, памер платы», — расказаў галоўны інжынер.

Найпершая задача платных паркоўак, на думку Пятра Пруднікава, — не папаўненне бюджэту, а рэгуляванне транспартных нагрузак. Плата ўводзіцца для таго, каб у любы час на паркоўцы заставаліся свабодныя месцы. Мэтазгоднасць такога падыходу паказала абсталяваная летась платная паркоўка на Прывакзальнай плошчы.

«Калі паркоўка забітая, кошт павінен павышацца. Калі 50 месцаў пустых — кошт павінен зніжацца», — перакананы спецыяліст.

Для тых, хто не плаціць за паркоўку, па сутнасці, ніякай адказнасці на цяперашні момант не існуе. Але распрацоўваецца нарматыўны дакумент, паводле якога даўжнік (які ўсё адно трапіць у базу) наступны раз павінен будзе заплаціць у павялічаным памеры. Калі гэтая мера не падзейнічае, на аўтаўладальніка змогуць падаць у суд.

Падобная мэта — рэгуляваць транспартныя нагрузкі — і ў эвакуацыі аўтамабіляў. Менавіта таму эвакуатары працуюць у месцах з найбольшай транспартнай нагрузкай з пункту гледжання паркоўкі. Летась у Мінску за няправільную паркоўку было эвакуявана і дастаўлена на ахоўныя стаянкі больш за 17 тысяч аўтамабіляў.

«Усе нядобрасумленныя аўтааматары заплацілі штраф за парушэнне правілаў дарожнага руху (у памеры адной базавай велічыні), паслугі па эвакуацыі транспартнага сродку на ахоўную стаянку (430 тысяч рублёў), захоўванне аўтамабіля (60 тысяч рублёў на тэрмін да сутак)», — прывёў разлікі Пётр Пруднікаў.

**Каб мінчане маглі даведацца, на што ідуць іх грошы, сабраныя за платную паркоўку, ствараецца спецыяльны сэрвіс на сайце *parkouka.by.***

Старшыня Мінгарвыканкама Андрэй Шорац на апошняй прэс-канферэнцыі паведаміў, што паступова ў Мінску пачнуць закрываць двары для паркоўкі. Па словах галоўнага інжынера, рэалізоўваць гэта пачнуць з двароў у раёне Прывакзальнай плошчы.

«Мы вывучылі гэты квартал па кожным жыльцы, па кожнай арганізацыі: калі хто прыязджае, колькі стаіць па гадзінах. Ёсць два шляхі: закрываць дваровыя тэрыторыі шлагбаумам альбо ўводзіць плату. Напрыклад, жылец будзе плаціць адзін гадавы плацеж, а ўсе астатнія будуць лічыцца парушальнікамі», — зазначыў Пётр Пруднікаў.

Раней гучала прапанова ўвесці плату за ўезд у горад, але, па словах спецыяліста, рабіць гэтага не будуць.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.** *seradzyuk@zviazda.by*

■ Спецыяльны рэпартаж

# БУДОЎЛЯ ПА КАНФУЦЫЮ:

## ЯК КІТАЙСКІЯ РАБОЧЫЯ СТВАРАЮЦЬ У БЕЛАРУСІ НОВЫ ЗАВОД



**У апошнія гады на ролю аднаго з галоўных стратэгічных партнёраў нашай краіны паступова выйшаў Кітай. Разам з калегамі з Паднябеснай беларусы рэалізуюць шэраг праектаў. Адзін з іх — будаўніцтва найбуйнейшага на прасторах былога СССР завода па вытворчасці трохслаёвага кардону ў Добрушы. Стварэнне прадпрыемства агульным коштам каля паўмільярда долараў распачалося ў 2012 годзе і цяпер выйшла на фінішную прамую. Карэспандэнты «Звязды» пабывалі на будоўлі і даведаліся, у чым галоўныя прынцыпы будаўніцтва па-кітайску.**



Тэрыторыя новага завода знаходзіцца побач са старой папяровай фабрыкай. Дарэчы, пасля здачы аб'ект будзе падпарадкоўвацца менавіта ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Беларускія шпалеры». У якасці экскурсавода па будоўлі выступае **начальнік тэхнічнага ўпраўлення гэтага прадпрыемства Ігар ДЗЕГЦЯРОЎ.** Паводле яго слоў, буйны праект моцна зменіць горад: з'явяцца новыя дарогі, зменшыцца транспартная нагрузка на славутыя добрушскія масты. На новым заводзе будзе створана каля 600 працоўных месцаў. Па генплане ён будзе складацца з 71 аб'екта, з іх шэсць — буйныя цэхі. Агулам фабрыка зойме плошчу ў 33 гектары.

— Пабудова комплексу — цалкам задача кітайскага боку, — распавядае спецыяліст. — Аднак беларусы таксама не засталіся без працы. Задача нашых работнікаў заключалася ў стварэнні інфраструктуры: пад'язной аўтадарогі, чыгуначнага пуці да комплексу, а таксама трансфарматарнай падстанцыі магутнасцю 55 мегават. Усе гэтыя аб'екты ўжо здадзены ў эксплуатацыю, беларускі бок цалкам выканаў свае абавязацельствы.

Як распавядае Ігар Дзегцяроў, першапачаткова час здачы завода кітайскім бокам (кампаніяй Xuan Yuan Industrial Development Co., LTD) быў прызначаны на снежань 2015-га. Аднак працы запаволіліся, а ў адаптаваным праекце тэрмін вызначаецца ўжо як снежань 2016-га. Цяпер на аб'екце працуе амаль 900 кітайскіх рабочых, разам з абслугоўваючым персаналам лічба дасягае 1200. Плануецца, што яна павялічыцца да 1 500. Для размяшчэння спецыялістаў з Паднябеснай побач з будпляцоўкай з'явіліся два жылыя гарадкі: першы — для мантажнікаў, інжынераў і перакладчыкаў, другі — для рабочых.



Кардонаробная машына ў некаторых месцах складаецца ажно з трох паверхаў.

Паводле кантракта, завод кітайскім бокам здаецца «пад ключ». Яшчэ да праходжання гарантыйных выпрабаванняў спецыялісты з КНР некаторы час будуць консультаваць айчынных спецыялістаў, аднак эксплуатавацца прадпрыемства будзе менавіта беларусамі. Ужо цяпер фарміруецца



штатны расклад, прызначаны будучыя кіраўнікі цэхаў. Дарэчы, прадпрыемства будзе працаваць кругласутачна.

Падыходзім да першага ўжо пабудаванага комплексу — водазаборнага. Зусім побач рака Іпуць, на якой больш як сто гадоў таму з'явілася першая ў Беларусі ГЭС. Адсюль будзе забірацца тэхнічная вада для вытворчасці кардону. Водаспажыванне завода па дакументах складае 15 тысяч кубаметраў за суткі, але тэхналогія зваротнага цыклу вады ў разы змяншае гэты паказчык. Тут жа з'явіцца ачышчальныя збудаванні, аналагаў якім у Беларусі няма. Гэта дазволіць звесці ўплыў вытворчасці на экалогію рэгіёна да мінімуму. Акрамя таго, атрыманы пры ачышчэнні іл будзе выкарыстоўвацца ў якасці біяпаліва.



Фота Надзеі БУЖАН.

Што ж будзе выпускаць будучае прадпрыемства? У першую чаргу, гэта трохслаёвыя кардоны SBB (мелаваны кардон з беленай цэлюлозы) і FBB (кардон для скрыняў і складной тары). Да гэтых прадуктаў выстаўляюцца высокія тэхнічныя патрабаванні, бо з іх робяць, напрыклад, упакоўкі для харчовых прадуктаў. Адпаведна, павінны быць выкананы гігіенічныя і іншыя параметры. Яшчэ адзін від прадукцыі — двухслаёвыя мелаваныя кардоны для паліграфіі і высокага ціснення, якія на постсавецкай прасторы ніхто не робіць. Аб'ёмы вытворчасці — 200 тысяч тон за год. Патрэбнасць Беларусі ў такім тавары складае 60 тысяч тон, астатняе пойдзе на экспарт у краіны СНД і Усходняй Еўропы.

Сыравіна — выключна беларуская. Будуць выкарыстоўвацца асіна і бяроза ў прапорцыі чатыры да аднаго. Неліквідны лес плануецца спальваць для атрымання энергіі.

Падыходзім да так званага цэха БХТММ (беленай хіміка-тэрмамеханічнай масы), які гатовы на 80%. Яго сэрца — рафінёр з магутнасцю электрарухавіка 17 мегават, які перамолвае драўніну да аднароднай масы. Для прыкладу, уся старая папяровая фабрыка спажывае ўсяго 5,5 мегавата. Для галоўнага рафінёра нават будаваўся асобны фундамент. Ён складаецца з дзвюх частак, паміж якімі знаходзяцца пракладкі для кампенсавання стартавай вібрацыі. Для работы такой машыны неабходна распрацаваць і сістэму плаўнага запуску, бо рэзкае ўключэнне можа выклікаць «прасадку» напругі па ўсёй Гомельскай вобласці.

Побач — цэх кардонаробнай машыны (КРМ), дзе непасрэдна і будзе вырабляцца прадукцыя. Першае, што ўражвае, — памеры збудавання. Даўжыня — каля паўкіламетра, толькі вытворчы канвеер цягнецца на 362 метры. На першым паверсе знаходзіцца ўчастак падрыхтоўкі хімікатаў, адсюль жа абслугоўваецца сама кардонаробная машына, якую манціруюць паверхам вышэй. Апарат складаецца са шматлікіх секцый, кожная з якіх адказвае за адзін з працэсаў, пры дапамозе якіх апрацоўваюць папяровае палатно: разліў, адсмоктванне вады, адціскание, сушка, фармоўка, рэзка. Што цікава, у сістэме пасля стадыі абрэзкі не выкарыстоўваюцца прыцiскныя ролікі, бо любыя няроўнасці на мелаваным кардоне лічацца бракам. Ліст утрымліваецца на канвееры пры дапамозе паддзімання — фактычна, ляціць у паветры.

Пры парушэнні вытворчага працэсу (напрыклад, абрыве кардоннага ліста) аўтаматыка спыняе канвеер і падымае спецыяльную металічную штору, за якой хаваюцца «унутранасці» машыны. Такім чынам, абслугоўваючы персанал адразу можа лакалізаваць праблему і правесці аператыўны рамонт.

— Завод будзе ўяўляць маленькі горад у горадзе, — распавядае Ігар Дзегцяроў. — Ад Добруша мы ніякіх інжынерных паслуг атрымліваць не будзем, тут усё сваё: водазабор, энергетыка. Ёсць праблема з падборам кадраў адпаведнай кваліфікацыі, асабліва нам не хапае інжынераў па прамысловай аўтаматыцы, праграмістаў. Цяпер агульная гатоўнасць завода знаходзіцца на ўзроўні 60%, і да завяршэння будаўніцтва мы павінны вырашыць гэта пытанне. Ужо сёння рыхтуем кадры, знайшлі перспектыўных маладых спецыялістаў, якія праходзяць навучанне, ездзяць у Кітай вучыцца на падобных заводах. Вядома, імкнёмся рабіць стаўку на добрушчаў, але прыедуць і работнікі з іншых рэгіёнаў.

Яшчэ адна дэталь, якая кідаецца ў вочы: літаральна на кожным працоўным месцы развешаны плакаты з агітацыяй. «Строгасць — значыць адказнасць за сябе і за сваіх родных», «Абавязкова адзявайце шлем», «Кожную дробязь правер, не лянуйся — выратуеш здароўе, а можа, і жыццё» і іншыя — вось яна праца па-кітайску?

**Сыравіна — выключна беларуская. Будуць выкарыстоўвацца асіна і бяроза ў прапорцыі чатыры да аднаго. Неліквідны лес плануецца спальваць для атрымання энергіі.**

— Насамрэч, у кітайскіх рабочых сапраўды асаблівая філасофія, — пацвярджае Ігар Мікалаевіч. — У іх усё па-іншаму, менш бюракратыі, больш працы. Ад задумы праекта да пачатку будоўлі праходзіць не больш за год. Атрымліваецца такая будоўля па Канфуцыю. Паміж беларускімі і кітайскімі інжынерамі ёсць адно значнае адрозненне. Калі нашы звычайна з'яўляюцца спецыялістамі шырокага профілю, то кітайцы дасканала ведаюць нешта адно і чужой працай ніколі не займаюцца. Думаю, для краіны з двума мільярдамі насельніцтва гэта правільны падыход, але не для нас.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*
*Мінск—Добруш—Мінск*

■ Інавацыі

# Лекі для хірургіі і камбустыялогіі

**На прадпрыемстве «Унітэхпрам» БДУ распрацаваны бізнес-план інавацыйнага праекта па арганізацыі вытворчасці арыгінальных біярэзарбаваных поліфункцыянальных лекавых прэпаратаў. Аўтары інавацый — дырэктар прадпрыемства Павел Бычкоўскі і вядучы супрацоўнік Навукова-даследчага інстытута фізіка-хімічных праблем БДУ Мікалай Юркштовіч.**

Бізнес-планам прадугледжваецца вытворчасць супрацьспаечнага сродку бар'ернага тыпу і лекавых сродкаў з антымікробным і анальгетычным эфектамі, якіяператвараюцца на раневай паверхні ў гідрафільную гелепадобную масу, забяспечваючы хуткае ачышчэнне ран і паскараючы працэс іх гаення. У прыватнасці, гаворка ідзе пра стварэнне поліфункцыянальнага сродку для прадухілення ўтварэння спаек пры хірургічных умяшаннях на органах брушной поласці, малога таза і іншых; вытворчасць лекавых сродкаў «Фосцэлантан» і «Мілфацэл» у выглядзе сурвэтак, якія забяспечваюць вільготнае гаенне ран; матрыкса для імабілізацыі ствалавых клетак і стварэнне біялагічных павязак для эфектыўнага лячэння пацыентаў з пашкоджаннямі скурных покрываў (з тэрмічнымі апёкамі, пролежнямі, трафічнымі язвамі). Усе прэпараты з'яўляюцца інавацыйнымі, раней у нашай краіне не выпрацоўваліся, а іх канкурэнтаздольнасць у параўнанні з імпартнымі аналагамі забяспечваецца больш высокай эфектыўнасцю і нізкімі цэнавымі паказчыкамі.

Рэалізацыя інавацыйнага праекта на прадпрыемстве «Унітэхпрам» БДУ дазволіць стварыць айчынную вытворчасць лекавых прэпаратаў для хірургіі і камбустыялогіі, забяспечыць незалежнасць гэтых абласцей медыцыны ад імпартных паставак, павысіць эфектыўнасць лячэння і скароціць тэрміны знаходжання пацыентаў у стацыянарах медыцынскіх устаноў.

Выкананне навукова-даследчых і доследна-тэхналагічных работ плануецца выконваць сумесна з НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ, дзяржаўным прадпрыемствам «НТЦ ЛОЦЫЯС» і клінічнымі ўстановамі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# ПАД НАГЛЯДАМ

## У Дзяржстандарце працягнуць працу па ахове ўнутранага рынку

**Штогод ведамства ажыццяўляе наглядную дзейнасць, а таксама стварае дзясяткі сертыфікатаў. Толькі летась у Дзяржстандарце зацвердзілі 2068 стандартаў і гарманізавалі з іх 105 СТБ і 1215 ДАСТаў з міжнароднымі і еўрапейскімі. Паслядоўная праца ў гэтым кірунку дазваляе Беларусі далучацца да агульнай базы нормаў, што прымяняюцца на знешніх рынках, і фарміраваць станоўчы імідж якасці нашай прадукцыі.**



### 500 НОВЫХ СТАНДАРТАЎ СЁЛЕТА

Спектр аб'ектаў стандартызацыі досыць шырокі. Камітэт працуе з машынамі, бытавымі электрапрыборамі, крыніцамі сілкавання, матэрыяламі для дарожнага будаўніцтва, сродкамі супрацьпажарнай аховы, лесаматэрыяламі, тканінай, харчовымі і нафтапрадуктамі, касметыкай. І ў гэтым няма нічога дзіўнага — Дзяржаўны камітэт па стандартызацыі з'яўляецца міжгаліновым органам, а значыць, працуе з усімі сферамі. Як расказаў падчас пасяджэння выніковай калегіі Дзяржстандарта **кіраўнік камітэта Віктар НАЗАРАНКА**, у гэтым годзе, практычна як і летась, плануецца распрацаваць больш за 500 дзяржаўных стандартаў. Сёлета намаганні беларускіх спецыялістаў будуць накіраваны на распрацоўку міждзяржаўных стандартаў, якія забяспечваюць выкананне тэхрэгламентаў Мытнага саюза па бяспецы машын і абсталявання, парфумерна-касметычнай і харчовай прадукцыі, прадукцыі лёгкай прамысловасці.

Акрамя таго, з'явілася і зацікаўленасць у стандартах у галіне менеджменту — стандартызацыя сучасных формаў і метадаў кіравання якасцю актыўна ўжываецца ў міжнароднай практыцы. Камітэт працягне супрацоўніцтва з беларускімі прамысловымі прадпрыемствамі. Сачыць за якасцю прадукцыі, якая выпускаецца, цяпер вельмі важна, бо гэта непасрэдна ўплывае на канкурэнтаздольнасць у рамках сусветнага рынку.

### 22 ТЭХРЭГЛАМЕНТЫ НА ПАДЫХОДЗЕ

Летась у Дзяржаўным камітэце па стандартызацыі працягвалі працу над тэхнічнымі рэгламентамі ЕАЭС і ўкараненнем тых, што прынялі раней у Мытным саюзе, а таксама рабілі ў іх неабходныя змены. У сілу ўжо ўступілі 34 рэгламенты (а сёлета ўступае яшчэ адзін), 22 тэхрэгламенты знаходзяцца ў стадыі распрацоўкі. Віктар Назаранка адзначыў, што яны датычацца энергетычнай эфектыўнасці, а таксама атракцыёнаў, угнаенняў, асобных відаў харчовай прадукцыі, абсталявання для дзіцячых гульнявых пляцовак, будаўнічых матэрыялаў. Таксама ў 2016 годзе ўступае ў сілу тэхнічны рэгламент, які вызначае патрабаванні да тытунёвай прадукцыі і завершыцца пераходны перыяд па сямі тэхрэгламентах, якія тычацца мэблевай прадукцыі колавых транспартных сродкаў, аўтадарог, выбуховых рэчываў і вырабаў на іх аснове, чыгуначнай галіны.

### ЛАБАРАТОРЫЯ, ЯКОЙ НЯМА АНАЛАГАЎ У ЕАЭС

У планах Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі на 2016 год таксама завяршыць стварэнне выпрабавальнага цэнтра па энергаэфектыўнасці прадукцыі. Ён будзе сучасным і не мець аналагаў у ЕАЭС і СНД. Дзякуючы яму стане магчымым комплексна выпрабоўваць электратэхнічную прадукцыю па параметрах энергаэфектыўнасці. Цэнтр будзе функцыянаваць на базе Беларускага дзяржаўнага інстытута стандартызацыі і сертыфікацыі. Яго з'яўленне дазволіць стварыць новыя працоўныя месцы ў сферах вызначэння параметраў энергаэфектыўнасці тэлевізійнай тэхнікі, бытавога і офіснага абсталявання, камп'ютараў і сервераў, воданагравальнікаў, пральных і сушыльных машын. Стварэнне цэнтра ажыццяўляецца па праекце міжнароднай тэхнічнай дапамогі ЕС "Падтрымка Рэспублікі Беларусь у галіне нормаў і стандартаў у сферы энергаэфектыўнасці спажывецкіх тавараў і прамысловай прадукцыі", а таксама па інвестпраекце Беларусі "Рэканструкцыя маёмаснага комплексу БелДІСС". Фінансаванне праектаў на закупку выпрабавальнага абсталявання ажыццяўлялася за кошт сродкаў ЕС — цана пытання каля 3,5 млн еўра, а рэканструкцыя плошчаў — за кошт рэспубліканскага бюджэту і складзе каля 30 млрд рублёў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**
*kryzhevich@zviazda.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 17 марта 2016 г. повторных торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества** | **Котельная 1979 года постройки, общая площадь 451.1 м.кв., фундамент бетон оштукатуренный, стены кирпичные, перекрытия ж/б, крыша рулонная, количество этажей 1 (один) (инвентарный номер в ЕГРНИ 630/С-46858; наименование: котельная; назначение: здание специализированное иного назначения)** |
| **Сведения о земельном участке** | Здание расположено на земельном участке 642000000001000776 площадью 5.3062 га. Площадь земельного участка под застройку здания составляет 424 кв.м |
| **Местонахождение имущества** | Минская обл., г. Молодечно, ул. Сухая, д. 89 |
| **Начальная цена** | 922 590 000 рублей |
| **Сумма задатка** | 92 000 000 рублей |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10 |
| **Балансодержатель (должник)** | Открытое акционерное общество «Передвижная механизированная колонна № 32», Минская обл, г. Молодечно, ул. Молодежная, 2«Б» |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

*Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.*

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона.

Аукцион проводится **17 марта 2016 г. в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 02.03.2016 по 15.03.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости».**

■ Чулі?

# ЭКОЛАГІ СКЛАЛІ «ЧОРНЫ СПІС»

**Віцебскі абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя склаў «чорны спіс» арганізацый і прадпрыемстваў, якія парушаюць прыродаахоўнае заканадаўства.**

— Вінаватым вынесеныя абавязковыя прадпісанні аб ліквідацыі парушэнняў, яны аштрафаваныя. Ім прад'яўленыя прэтэнзіі аб кампенсацыі шкоды, нанесенай навакольнаму асяроддзю, — паведаміў **Юрый КАРАЛЁЎ, начальнік аддзела аператыўнага кантролю Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя**. — Самі спісы састаўляюцца, пачынаючы з 2012 года. І калі раней у іх былі назвы некалькіх прадпрыемстваў, то сёлета — больш за 10. За паўгоддзе падчас маніторынгу прааналізуем, што зроблена парушальнікамі па выпраўленні сітуацыі. І можам выдаліць назву.

Дык каго і за што ж канкрэтна ўнеслі ў спіс? Сярод парушальнікаў нямала і прадпрыемстваў сістэмы ЖКГ.

«Дзісенскі лясгас» «атрымаў славу» за несанкцыянаванае захаванне 7 тон адходаў дрэваапрацоўкі ў кар'еры для здабычы пяску. Гарадоцкім прадпрыемствам меліярацыйных сістэм дапушчана 5 фактаў несанкцыянаванага захавання будаўнічых адходаў пры зносе будынкаў і памяшканняў. Забруджванне водных аб'ектаў было дапушчана КУП «Браслаў-камунальнік». УП ЖКГ Шумілінскага раёна ажыццяўляла скід забруджвальных рэчываў (сцёкавыя воды) у рэчкі Бабро̆ўка і Пахучка. А на прадпрыемстве ЖКГ «Лепель» неаднаразова перавышалі нарматывы выкідаў у паветра (азоту дыяксіду і вугляроду аксіду).

Дарэчы, тэрытарыяльнымі органамі Мінпрыроды сярод іншага магчыма і прыпыненне эксплуатацыі асобных установак, цэхаў, аб'ектаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

■

## НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў САКАВІКУ

3, чацвер, 5.00 — 12.00
7, панядзелак, 10.30 — 21.00
9, серада, 4.00 — 21.30
11, пятніца, 20.30 — 22.00
13, нядзеля, 12.00 — 23.00
15, аўторак, 19.00 — 24.00
16, серада, 0.00 — 3.00
18, пятніца, 6.30 — 10.00
19, субота, 22.00 — 24.00
20, нядзеля, 0.00 — 19.30
22, аўторак, 7.00 — 24.00
23, серада, 0.00 — 7.30
24, чацвер, 22.30 — 24.00
25, пятніца, 0.00 — 20.00
27, нядзеля, 9.30 — 24.00
28, панядзелак, 0.00 — 8.30
30, серада, 4.00 — 19.30

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 18 марта 2016 г. повторных торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества** | **Изолированное помещение (административное помещение), расположенное по адресу: г. Минск, ул. Нововиленская, 38, помещение 6, общей площадью 18,3 м$^2$ (инвентарный номер в ЕГРНИ 500/D-708025125; наименование: административное; назначение: административное помещение)** |
| **Местонахождение имущества** | г. Минск, ул. Нововиленская, 38, помещение 6 |
| **Начальная цена** | 262 288 800 рублей |
| **Сумма задатка** | 26 200 000 рублей |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», 220030, г. Минск, ул. К.Маркса, 39, ком. 10 |
| **Балансодержатель (должник)** | БП СП ООО «Бокемин» |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

*Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.*

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона.

Аукцион проводится **18 марта 2016 г. в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 02.03.2016 по 15.03.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости».**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** | | |
| **Продавец** | **Минское районное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24** | | |
| **Предмет аукциона** | | | |
| **Наименование** | **Общая площадь** | **Инвентарный номер** | **Адрес** |
| **Лот № 1** | | | |
| **Магазин №39** | 137,7 кв.м | 600/С-139782 | Минская обл., Минский р-н, Роговский с/с, д. Головачи, 2А |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,2038 га** предоставлен продавцу на праве аренды сроком по 18.09.2032 для обслуживания здания магазина | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 110 000 000 белорусских рублей (снижена на 85%)** | | | |
| **Лот № 2** | | | |
| **Магазин № 63** | 97,7 кв.м | 600/С-136917 | Минская обл., Минский р-н, Горанский с/с, д. Великое Село |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,0768 га**, предоставлен продавцу на праве аренды по 06.12.2041 для обслуживания здания магазина с ограничением (водоохранная зона) | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 152 000 000 белорусских рублей** | | | |
| **Лот № 3** | | | |
| **Здание магазина** | 71,1 кв.м | 600/С-150281 | Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Приморская, 1А |
| **Сведения о земельном участке**: **пл. 0,0156 га** предоставлен на праве аренды сроком по 06.08.2042 для обслуживания здания магазина с установленными ограничениями (водоохранная зона водных объектов) | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 295 000 000 белорусских рублей (снижена на 12%)** | | | |
| **Лот № 4** | | | |
| **Склад** | 20,4 кв.м | 600/С-150472 | Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Набережная, 2Б |
| **Сведения о земельном участке**: **пл. 0.0099 га** предоставлен на праве аренды сроком по 19.03.2018 для обслуживания здания склада с установленными ограничениями (водоохранная зона водных объектов) | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 190 000 000 белорусских рублей (снижена на 25%)** | | | |
| **Лот № 5** | | | |
| **Сарай** | 14,2 кв.м | 600/С-150471 | Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Набережная, 2В |
| **Сведения о земельном участке**: **пл. 0.0062 га** предоставлен на праве аренды сроком по 19.03.2018 для обслуживания здания сарая с установленными ограничениями (водоохранная зона водных объектов) | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 115 000 000 белорусских рублей (снижена на 25%)** | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с 3012343260010; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | | |
| Извещение о проведении предыдущих аукционов опубликовано **в газете «Звязда» от 27.01.2016.** | | | |
| **Аукцион состоится 15.03.2016** в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 14.03.2016** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-183-69-71. www.cpo.by. **E-mail: auction@cpo.by** | | | |

■ Узровень

# Пасляховыя нэпы Скакуна

**Больш за трыццаць гадоў Аляксей Сцяпанавіч СКАКУН узначальвае СВК «Астрамечава» Брэсцкага раёна. Калі здаралася з ім ездзіць па вытворчых брыгадах і падраздзяленнях, складвалася ўражанне, што ён ведае кожнага, хоць гэта амаль немагчыма, калектыў СВК складаецца з 800 чалавек. Сам Скакун гаворыць, што асабіста ведае большасць працаўнікоў, а яшчэ пенсіянераў, якія верай і праўдай адслужылі ў калгасе (старэйшыя людзі так і называюць сваю гаспадарку).**



«Астрамечава», вядомае ў краіне сельскагаспадарчае прадпрыемства, мае надзвычай разнапланавую вытворчасць. У структуру кааператыва ўваходзяць чатыры вытворчыя ўчасткі з паляводчымі брыгадамі, на якіх функцыянуюць сем малочнатаварных фермаў, комплекс па вырошчванні буйной рагатай жывёлы, племянная звераферма, сад, аўтабаза, будаўнічы камбінат, камбінат па перапрацоўцы сельгаспрадукцыі. Яшчэ ў «Астрамечаве» ёсць цэх па пашыве адзення з футра норак. І гэта далёка не поўны пералік усіх гаспадарчых падраздзяленняў махіны пад абрэвіятурай СВК, якая шмат гадоў эфектыўна працуе.

Слова «махіна» тут ужытае нездарма. «Астрамечава» — адно з найбуйнейшых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў краіны. У 1982 годзе на базе былога калгаса «Памяць Ільіча» ўтварылі калгас-камбінат з чатырох эканамічна адсталых гаспадарак Брэсцкага і Камянецкага раёнаў. Такое вялікае прадпрыемства было неабходнае, каб забяспечыць кармамі комплекс па адкорме і вырошчванні 10 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы. Тады, у далёкім 1982-м, гаспадарку і ўзначаліў Аляксей Скакун.

Цяпер Аляксей Сцяпанавіч успамінае, што пачыналі з навядзення элементарнага парадку. Пасля рэарганізацыі былых калгасаў гэта было найбольш актуальна. Даводзілася змагацца з крадзяжамі, прывучаць рабочых і спецыялістаў да дысцыпліны і культуры вытворчасці. Пазней у адной са сваіх кніг, прааналізаваўшы першыя крокі, ён умоўна выдзяляе этапы станаўлення гаспадаркі і называе іх «нэпамі». Бо, напрыклад, на другім этапе дзякуючы новай эканамічнай палітыцы калгаса-камбіната аплата стала цесна ўвязваецца з працоўнай дысцыплінай і канчатковымі вынікамі. Апошняе разам з інтэнсіўнымі тэхналогіямі дазволіла на тых жа кармах атрымліваць значна больш прадукцыі і стала прарывам, вывела гаспадарку з заняпаду. Праца станавілася больш механізаванай, моладзь перастала масава ўцякаць у горад, многія заставаліся ў родных мясцінах. Пачалі ўзводзіць сучаснае жыллё, мяняўся побыт вяскоўцаў, іх лад жыцця.

Трэці астрамечаўскі «нэп» прагучаў як навукова-эканамічны прагрэс. Паводле сцвярджэння аўтара, у XXI стагоддзі развіццё любой вытворчасці магчыма толькі ў гармоніі з навукай і высокімі тэхналогіямі. Пра чацвёрты «нэп» загаварылі як магчымасць выпускаць новую экалагічную прадукцыю. Як ужо адзначалася, сельскагаспадарчы кааператыў мае цэлую сетку падсобных вытворчасцяў. Працуюць цэхі па вырабе соку і чыпсаў з яблыкаў уласнага саду. Пакупнікі шукаюць у краме малако, смятану, вяршкі з брэндам «Астрамечаўскае». І гэтым брэндам тут надзвычай даражаць.

Ёсць і яшчэ адзін «нэп», звязаны з навукай, эканомікай і вытворчасцю.

Яно і зразумела, у гаспадарцы, якую ўзначальвае доктар эканамічных навук, мусіць быць да навукі асаблівае стаўленне. Некалькі гадоў таму аўтару гэтых радкоў давялося прысутнічаць на справаздачна-выбарным сходзе СВК. Дык вось тэме павышэння кваліфікацыі супрацоўнікаў, вучобе маладых, атрыманні імі дадатковай адукацыі ў дакладзе было адведзена даволі вялікае месца. Пра гэта мы гаварылі з Аляксеем Сцяпанавічам падчас аднаго з апошніх інтэрв'ю ў мінулым годзе. Ён нагадаў сваю любімую формулу, якую не стамляецца даводзіць маладым калегам: «Чым менш будзе прыкладзена інтэлекту, тым больш спатрэбіцца рэсурсаў і энергіі». І працягваў: «Калі як след раскінеш мазгамі, не паленуешся зазірнуць у літаратуру, заўсёды знойдзеш, дзе сэканоміць. Напрыклад, на рэканструкцыі адной фермы мы эканомім трэць сродкаў, таму што робім уласнымі сіламі, а не наймаем старонню арганізацыю». СВК, дарэчы, мае свой будаўнічы цэх з праектным бюро.

Разважанні, меркаванні, выкладкі на тэму арганізацыі сельгасвытворчасці вопытнага аграрыя за гэтыя гады выліліся ў некалькі кніг па эканоміцы сельскай гаспадаркі. Цяпер па яго кнігах могуць вучыцца пачаткоўцы. А сам Аляксей Сцяпанавіч заўсёды быў ды і застаецца вельмі ўдзячным вучнем. Колькі разоў даводзілася сустракацца з ім пры падрыхтоўцы матэрыялаў пра Астрамечава, ні разу не абышоў ён добрым словам свайго настаўніка — двойчы Героя Сацыялістычнай Працы Уладзіміра Антонавіча Плюцінскага з суседняй Ровенскай вобласці Украіны. Адзін з найлепшых сельскіх кіраўнікоў Савецкага Саюза больш за трыццаць гадоў таму шчодра дзяліўся з навічком навукай гаспадарання. Тыя ўрокі, вядома, пайшлі на карысць. І ўжо пазней, калі «Астрамечава» стала грымець на ўсю краіну поспехамі, дружба двух кіраўнікоў працягвалася. У яго, Плюцінскага, некалі падгледзеў Скакун вопыт звераферміы. Тады ў нашай краіне ніхто падобнай вытворчасцю не займаўся. Норкавую ферму адкрылі ў Астрамечаве даўно, і яна па-ранейшаму дае неблагі даход, служыць крыніцай папаўнення запасаў валюты.

Аграгарадка. Заходзіш у Дом культуры — і вочы міжволі спыняюцца на фотапартрэце невялікага хлопчыка з выразным позіркам. «Гэты ўжо даўно студэнт», — каментуе аўтар здымка. Думаю, што і таму студэнту, і яго бацькам вельмі прыемна бачыць фотаработу, як, прынамсі, і іншым прататыпам партрэтаў.

Старшыня рэспубліканскага аграпрамысловага саюза і кіраўнік грамадскага аб'яднання «Беларускі сялянскі савет», доктар эканамічных навук, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі на-

**Пачыналі з навядзення элементарнага парадку. Пасля рэарганізацыі былых калгасаў гэта было найбольш актуальна. Давялося змагацца з крадзяжамі, прывучаць рабочых і спецыялістаў да дысцыпліны і культуры вытворчасці.**

Аляксей Скакун ганарыцца і дружбай з лётчыкам-касманаўтам Пятром Клімуком. Пётр Ільіч, дарэчы, мінулым летам стаў ганаровым госцем астрамечаўскіх дажынак. Няма творчых асоб — пісьменнікаў, паэтаў, мастакоў — пабывала ў Астрамечаве. Пра ўсё гэта можна даведацца з выставы фотаздымкаў, якая размешчана на сценах Дома культуры. Аляксей Сцяпанавіч даўно захапляецца фатаграфіяй. Дзякуючы яго назіральнасці і майстэрству тут з'явілася цэлая галерэя са славутымі гасцямі, а таксама хроніка будзённага жыцця вёскі. На здымках можна ўбачыць шмат каго з працаўнікоў, а таксама маладое пакаленне

вук Аляксей Скакун 1 сакавіка адзначае «круглую дату» — 70 гадоў. Да свайго юбілею ён падышоў, маючы цэлую скарбонку дзяржаўных узнагарод. Скарбонка гэта пачала напаўняцца яшчэ ў савецкія часы — напрыклад, ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Новымі этапамі прызнання (міжволі склаўся яшчэ адзін нэп у калекцыю знакамітага аграрыя) стала прысуджэнне летась старшыні СВК «Астрамечава» звання ганаровага грамадзяніна Брэсцкага раёна і ўзнагароджанне яго ордэнам Айчыны III ступені.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

■

■ Чалавек і яго справа

# ПРЫКЛАД ПАКАЗАЛА МАМА

## Даіць кароў — прафесія не толькі жаночая

**У гэтым пераконвае сваёй працай аператар машыннага даення малочнатаварнай фермы «Вігушкі» сельгаскааператыва «Умястоўскі» Іўеўскага раёна 29-гадовы Аляксей КАРНІЛАЎ. А прыклад яму паказала мама Валянціна Васілеўна, якая, дарэчы, доўгі час пражыла ў горадзе.**

З самымі блізкімі адзін для аднаго людзьмі, а таксама калегамі мы сустрэліся на ферме падчас іх перапынку. У той дзень яны, як звычайна, прыйшлі на работу а 5-й гадзіне раніцы, а дахаты вернуцца ўвечары, пасля трэцяй дойкі. Наступны дзень — выхадны, паслязаўтра ім зноў — на ферму.

Тут, на ферме «Вігушкі», яны працуюць трэці год, а ўвогуле Валянціна Васілеўна прафесійна доіць кароў ужо 20 гадоў, у Аляксея стаж таксама салідны — практычна пасля заканчэння школы. Цяпер гэта здаецца ім натуральным, быццам інакш не магло і скласціся. Хоць у Расіі, у Краснаярскім краі, дзе нарадзіўся Аляксей, яны былі гарадскімі жыхарамі і наўрад ці бачылі сябе ў гэтай прафесіі. Такі нечаканы паварот адбыўся, калі сям'я вярнулася на малую радзіму маці ў Беларусь. Спачатку жылі ў Воранаўскім раёне, дзе Аляксей закончыў школу, потым пераехалі на Іўеўшчыну.

— Калі я ўпершыню прыйшла на ферму, то кароў баялася. Памятаю, ад адной, не надта «ветлівай», нават драпака давала. Але чалавек да ўсяго прызвычайваецца — абы жаданне, — кажа Валянціна Васілеўна.

Пасля школы Аляксей вывучыўся ў ліцэі на слесара, а затым паступаў у аграрны каледж на спецыяльнасць ветэрынарнага фельчара, аднак не хапіла літаральна аднаго бала. Тады і вырашыў заняцца справай, з якой быў знаёмы яшчэ з дзяцінства, дапамагаючы маме даглядаць свойскую жывёлу. Ды і на ферме ёй Лёша дапамагаў яшчэ школьнікам. Калі ж прыйшоў на пастаянную працу, то Валянціна Васілеўна аддала яму сваю групу кароў, а сама стала падменнай даяркай. Аляксей так добрасумленна ставіўся да работы, што выдатна асвоіў, пэўна, самы складаны ў малочнай жывёлагадоўлі працэс — раздойвання першацёлак.

— Нават мясцовыя жыхары пасля яго жывёлу забіралі, — ганарыцца сынам Валянціна Васілеўна.

Ферма, дзе яны цяпер працуюць, — не самая перадавая, аднак за апошнія гады ўмовы працы тут значна палепшыліся. Гэта тычыцца і аўтаматызацыі тэхналагічных працэсаў, і камп'ютарнага ўліку надояў ад кожнай каровы. Зрэшты, нават на суперсучасных, рабатызаваных комплексах асноўным заўсёды, напэўна, будзе ўсё ж менавіта чалавечы фактар.

— Самае галоўнае — адносіны да жывёлы. І даенне, і догляд. Жывёла не гаворыць, але ўсё адчувае, разумее, як чалавек да яе ставіцца. І ты павінен яе разумець, — лічыць Аляксей.

— А можна заўважыць, што карова дрэнна сябе адчувае?

— Канешне. Здараецца, нават не па колькасці малака, а па поглядзе каровы, нейкай млявасці можна вызначыць, што з ёй нешта кепскае. І тады трэба адразу ж паведаміць урачам. Ад такога ўзаемаразумення залежыць добрае самаадчуванне жывёлы і, адпаведна, удой, — лічыць Аляксей.

Невыпадкова ж бывае, што не ў кожнай даяркі атрымліваецца нармальна падаіць чужую групу кароў.



Фота Станіслава ЗЯНКЕВІЧА.

**Аператары машыннага даення Валянціна Васілеўна і Аляксей КАРНІЛАВЫ.**

Аляксей, як падалося, чалавек сціплы, немнагаслоўны, аднак калі размова тычыцца жывёлы, то голас быццам цяплее. І гэта зусім не паказушна, не «для прэсы».

— Бачылі б вы, як Лёша сам-насам размаўляе са сваімі жывёламі. «Любачка мая, прыгажуня». Некаторым любімцам нават мянушкі прыдумаў, — расказвае Валянціна Васілеўна.

Дробязі? Не! Бо калі нейкую тэхнічную непаладку можна выправіць, то прымусіць чалавека з душой ставіцца да жывёлы немагчыма. Ні Валянціну Васілеўну, ні Аляксея прымушаць не трэба.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*
*Іўеўскі раён*

■

**ДА ТЭМЫ**

*Падумалася: можа, Аляксей Карнілаў, прагуючы аператарам машыннага даення, сярод прадстаўнікоў моцнага полу ледзь не «адзіны з магікан» на Гродзеншчыне? Адпаведная гендэрная статыстыка не вядзецца, аднак у аддзеле кадраў Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гродзенскага аблвыканкама ўсё ж паведамілі такую лічбу: па стане на красавік мінулага года ў гаспадарках вобласці сярод аператараў машыннага даення 31 — мужчыны. Мо зараз і больш?*

■ Факт

### ЗАРАДЗЯЦЬ КАСЕТЫ ЖАЛУДАМІ

А праз год маладыя дубкі ўтвораць новыя насаджэнні

**У Рэспубліканскім лясным селекцыйна-насенняводчым цэнтры прыступілі да падрыхтоўкі касет для вырошчвання пасадачнага матэрыялу дуба з закрытай каранёвай сістэмай. Больш за 26 тысяч касет будуць запоўнены спецыяльным субстратам і адгружаны сямі лясгасам Гомельскай вобласці, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі.**

Высяваць жалуды ў падрыхтаваныя ячэйкі будуць ужо спецыялісты ў Мілашэвіцкім, Рэчыцкім, Светлагорскім, Жлобінскім, Петрыкаўскім, Мазырскім і Калінкавіцкім лясгасах. Там жа з захаваннем усіх тэхналагічных патрабаванняў і пачнуць вырошчваць высакаякасны пасадачны матэрыял. А праз год гэтымі маладымі дубкамі пачнуць ствараць новыя насаджэнні.

Вырошчванне пасадачнага матэрыялу з закрытай каранёвай сістэмай вядзецца ў галіне ў рамках укаранення фінскіх тэхналогій лесавырошчвання для павышэння эфектыўнасці лесааднаўлення і лесаразвядзення. Яго выкарыстанне дазваляе падаўжаць тэрміны пасадкі лясных культур, скарачаць колькасць даглядаў за насаджэннямі і ў перспектыве павялічваць даходы ад лесагаспадарчай дзейнасці. У адпаведнасці з галіновай праграмай, разлічанай да 2020 года, планавуецца вырошчваць не менш за 30 мільёнаў раслін з закрытай каранёвай сістэмай. Імі будуць створаны 30 працэнтаў лясных культур. Летась у лясгасах галіны было вырашчана 5,6 мільёна штук пасадачнага матэрыялу з закрытай каранёвай сістэмай. Гэта ў восем разоў больш, чым было пяць гадоў таму.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Ігуменскі тракт
№ 8 (154)

■ Імя ў летапісе

# ГОРАД, ШТО ПАЎСТАЎ З БІТВЫ

## На Дні нараджэння Мінска можна будзе паслухаць Баяна і патрымаць у руках сапраўдныя артэфакты

**Так-так, вы не памыліліся: Дзень горада мы адзначалі паўгода таму, у верасні. Але ж у нашай сталіцы ёсць яшчэ адзін, летапісны дзень нараджэння. 949 гадоў таму, 3 сакавіка 1067 года, адбылася знакамітая бітва на Нямізе, у сувязі з якой гістарычны Менск упершыню згадваецца ў пісьмовых крыніцах. У той бітве сышліся войскі Яраславічаў — Ізяслава Кіеўскага, Святаслава Чарнігаўскага і Усевалада Пераяслаўскага — і войска Усяслава Полацкага, якое было разбіта, а сам князь неўзабаве трапіў у вязніцу. Падзеі тых часоў схаваны глыбока пад зямлёй, авеяны легендамі, ахутаны вэлюмам таямніц. Шмат сплыло вады, не шумяць хвалі Нямігі, не рыпяць вароты мінскай брамы, а спрэчкі аб мінулым дагэтуль не сціхаюць. Дзе знаходзіўся старажытны Менск? Адкуль яго імя? Якія берагі амывала Няміга?**

Пашукаць адказы на гэтыя і іншыя пытанні прапануе Музей гісторыі горада Мінска. Трэцяга сакавіка з 18 гадзін у Мінскай ратушы мінчан і гасцей сталіцы чакае сапраўдная містэрыя. Распачне прадстаўленне гусляр — ён будзе ўвасабляць таго самага Баяна, што згадваецца ў «Слове пра паход Ігаравы». Прагучыць і фрагмент «Слова» ў перакладзе Янкі Купалы.

Падрабязней даведацца пра старажытную бітву на Нямізе дапамогуць выступленне знакамітага даследчыка, гісторыка і археолага Сяргея Тарасава і паказ дакументальных здымкаў з раскопак 1984 года. Але няхай вас не палохае перспектыва трапіць на сумную лекцыю: па-першае, сумным выступленне дакладна не будзе, а па-другое, яго зменіць інтэрактыў. Ахвотных праверыць свае веды ў старажытнай гісторыі Мінска чакае музейная гульня з цікавымі падарункамі: гульцы, адпаведна тэматыцы, будуць змагацца ў войску Усяслава Чарадзея і братоў Яраславічаў. Супрацоўнікі музея абяцаюць, што лідары гульні змогуць патрымаць у руках сапраўдныя артэфакты.

Адчуць усё хараство нашай сталіцы дапаможа выступленне мастацтвазнаўцы Сяргея Харэўскага — аднаго з найбуйнейшых знаўцаў гарадской архітэктуры. Свае погляды на Мінск прадставяць таксама пісьменнік і журналіст Міхаіл Валодзін (аўтар захапляльнай кнігі «Мінскія гісторыйкі»), краязнавец Вадзім Зелянкоў, экскурсавод Цімафей Акудовіч (арганізатар ужо шмат гадоў любімага мінчанамі і не толькі «Фэсту экскурсаводаў»), журналіст Васіль Сямашка, які нядаўна спусціўся ў калектар і паглядзеў, як цяпер выглядае легендарная рака Няміга.

І яшчэ адзін прыемны момант: уваход на Дзень нараджэння летапіснага Мінска — вольны, адзінае — ахвотным трэба будзе загадзя ўзяць бясплатныя запрашэнні. Атрымаць іх можна ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага па адрасе: пл. Свабоды, 15 з серады па нядзелю з 11.00 да 19.00 (да 3 сакавіка ўключна, але майце на ўвазе: колькасць білетаў абмежаваная).

— Гэта мерапрыемства распачне цыкл «Ад Менска да Мінска: каляндар падзей», — расказвае **старшы навуковы супрацоўнік музея Марыя КАРАЛЁВА**. — Шэраг яго імпрэзаў будзе праходзіць цягам года. Яны будуць прысвечаны гістарычным падзеям Мінска, пра якія мала хто згадвае. Наступнае мерапрыемства адбудзецца 19 сакавіка, яно будзе прысвечана наданню Мінску Магдэбургскага права. У нас будзе інтэрактыўная праграма з чытаннем Права. З гледачоў выберам войта, гараджаніна, бургамістра, рамесніка, сфармуем з іх магістрат. Будзе цікава!

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
*seradzyuk@zviazda.by*



Бітва на Нямізе. Мініяцюра з Радзівілаўскага летапісу.

■ Гэта цікава

# АБЫСЦІ ЎСЕ МУЗЕІ



Карэспандэнтка «Звязды» (у цэнтры) падчас праходжання квэсту па гісторыі.

**Час не стаіць на месцы. А разам з ім змяняюцца і спосабы падачы інфармацыі, у тым ліку папулярызацыі нашага мінулага. Каб данесці веды па гісторыі да большай колькасці людзей, каб зрабіць гэта ў цікавай і неназойлівай форме, у Нацыянальным гістарычным музеі сумесна з кампаніяй Velcom распрацавалі квэст па гісторыі — гульню, што прадугледжвае пошук адказаў на пытанні, знаходжанне падказак у загадзя запланаваных арганізатарамі месцах.**

Новая забаўка дапамагае лепш азнаёміцца з экспазіцыяй Нацыянальнага гістарычнага музея і яго філіялаў, у запасніках якіх знаходзіцца найбольшая колькасць экспанатаў у параўнанні з іншымі музеямі краіны.

Пачынаецца дзея ў галоўным корпусе музея. Каб знайсці адказы на пытанні, даводзіцца скрупулёзна азнаёміцца спачатку з экспазіцыяй, прысвечанай старажытным часам, затым здагадацца, пра якія персаналіі вядзецца гаворка, дзякуючы прадметам і партрэтам, размешчаным у геральдычнай зале. Хтосьці можа падумаць, што развязка дзесьці блізка... Аднак тут толькі пачынаецца самае цікавае. Даводзіцца выходзіць за межы музея, блукаць па гістарычнай частцы сталіцы, зазірнуць у музей гісторыі беларускага кіно і ў былы дом масонаў — цяпер Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры, — каб таксама знайсці там правільныя адказы і атрымаць магчымасць рухацца далей...

Квэст не патрабуе ад удзельнікаў выдатнага ведання гісторыі. Наадварот, шмат што можна адкрыць для сябе падчас праходжання гульні. Справіўшыся аднойчы з такой гульнёй, будзе нашмат прасцей праводзіць экскурсію па сталіцы для сваіх знаёмых — пэўная частка гісторыі Мінска складзецца ў адно лагічнае цэлае.

Гульня разлічана як на дзяцей, так і на дарослых — усім будзе цікава знайсці адказы, разглядваючы музейныя экспанаты ці блукаючы па вуліцах горада. Дарэчы, у найбліжэйшы месяц каманды журналістаў (нават са сваімі сем'ямі) могуць прайсці гэты квэст бясплатна. У будучыні ж паслугу, верагодна, можна будзе набываць у Нацыянальным гістарычным музеі, у межах пэўнай экскурсіі ці з квіткамі для наведвання розных філіялаў.

**Дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Алег РЫЖКОЎ** адзначае:

— Летась у нашым музеі адкрылася інтэрактыўная прастора, што дапамагае выкарыстоўваць сучасныя адукацыйныя формы працы з дзецьмі розных узростаў. А новы квэст, мы ўпэўнены, зробіць наведванне музея яшчэ больш цікавым — як для малечы, так і для іх бацькоў. Ён дазваляе ў гульнявой форме агледзець пастаянныя экспазіцыі музея і яго філіялаў... Ствараючы гэтую гульню, мы ставілі сабе на мэце стымуляваць цікаўнасць і інтарэс да гісторыі Беларусі і Мінска паказаць, што ў гісторыі нашай краіны шмат займальных фактаў.

Заданні квэсту зроблены ў электроннай форме. Для таго каб атрымаць іх, трэба мець пры сабе мабільны тэлефон ці планшэт з аперацыйнай сістэмай Android ці IOS. Прасканаваўшы спецыяльны код, удзельнік квэста атрымае на свой гаджэт першае заданне — як у гукавой, так і ў тэкставай форме. Пасля ўвядзення правільнага адказу адразу будзе з'яўляцца новае заданне і арыенцір на карце.

Варта дадаць, што разам з квэстам быў прэзентаваны другі нумар электроннага гістарычнага часопіса для дзяцей «Музейныя вандроўкі» — сумеснага праекта музея кампаніі Velcom. На гэты раз выданне прысвечана замкам Беларусі. Аповед у ім грунтуецца на экспанатах са збораў Нацыянальнага гістарычнага музея. Дарэчы, першы нумар часопіса прагледзелі пяць тысяч чалавек.

Як бачым, гісторыя рухаецца: яна знаходзіць усё новыя шляхі да сэрцаў і розумаў сучаснікаў. Варта і нам не адставаць, адкрываючы для сябе тыя навінкі, што дапамагаюць лепш зразумець мінуўшчыну.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

■ Рарытэты

# ЗАЗІРНУЦЬ У ВОЧЫ... ГІСТОРЫІ

Предметом залога являются государственные долгосрочные облигации 172-го выпуска в количестве 375 000 штук, номинированные в иностранной валюте (далее – облигации ВГДО 172), находящиеся в собственности Банка, не обремененные (не заложенные) по иным обязательствам Банка.

**10. Период проведения открытой продажи облигаций**

Банк проводит открытую продажу Облигаций с 31.03.2016 по 30.09.2017, если иной срок до окончания открытой продажи Облигаций не будет определен Правлением и Наблюдательным советом Банка. Период проведения открытой продажи Облигаций может быть сокращен также в случае полной реализации всего объема эмиссии Облигаций.

**11. Место и время проведения открытой продажи облигаций**

Размещение Облигаций осуществляется Банком путем их открытой продажи на внебиржевом и/или биржевом рынках.

На внебиржевом рынке размещение Облигаций осуществляется на основании договоров открытой продажи Облигаций департаментом инвестиций и ценных бумаг центрального аппарата Банка (Республика Беларусь, 220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18, тел. (017) 3090433, факс (017) 2222626), а также учреждениями Банка (филиалами-областными (Минским) управлениями, филиалами, центрами банковских услуг). Отделения Банка в размещении Облигаций не участвуют.

Список учреждений Банка размещен на официальном интернет-сайте Банка (http://belarusbank.by), а также в Проспекте эмиссии двести одиннадцатого выпуска облигаций Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк». Время проведения продажи Облигаций на внебиржевом рынке – ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, установленных в Республике Беларусь, в соответствии с регламентом работы соответствующего учреждения Банка.

Правление Банка может принять решение об ином способе открытой продажи Облигаций на внебиржевом рынке, в том числе об открытой продаже Облигаций с использованием каналов дистанционного банковского обслуживания.

О своем решении Банк оповещает физических лиц посредством публикации информации на официальном интернет-сайте Банка (http://belarusbank.by) не позднее десяти рабочих дней с даты принятия решения Правлением Банка.

На биржевом рынке размещение Облигаций осуществляется в торговой системе Открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа» (далее – Биржа) в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Покупатели могут приобрести Облигации на биржевом рынке только с использованием услуг профессионального участника рынка ценных бумаг – члена секции фондового рынка Биржи (далее – Профучастник). Список Профучастников размещен на официальном интернет-сайте Биржи в разделе: http://www.bcse.by/bcse-stock-market/participants/stockMembers.aspx.

Время проведения продажи Облигаций – в соответствии с регламентом торгового дня Биржи.

**12. Покупатели облигаций**

Покупателями Облигаций могут быть физические лица – резиденты и/или нерезиденты Республики Беларусь (далее – Физические лица).

**13. Порядок определения стоимости облигации при проведении открытой продажи облигаций**

В день начала открытой продажи Облигаций (31.03.2016), а также в даты выплаты процентного дохода Облигации продаются Покупателю по цене, равной номинальной стоимости Облигации. Даты выплаты процентного дохода указаны в пункте 18 настоящего документа.

В иные дни периода открытой продажи Облигации продаются по их текущей стоимости.

**14. Срок обращения Облигаций** – 731 календарный день (с 31.03.2016 по 01.04.2018). Для расчета срока обращения Облигаций день начала размещения и день начала погашения Облигаций считаются одним днем.

**15. Дата начала погашения Облигаций** – 01.04.2018. Дата окончания погашения Облигаций совпадает с датой начала погашения Облигаций.

**16. Размер дохода по облигациям, условия его выплаты**

По Облигациям установлен постоянный процентный доход (далее – доход), выплачиваемый владельцам Облигаций периодически в течение срока обращения Облигаций.

Ставка дохода по Облигации равна 5,0 (Пяти) процентам годовых.

Доход выплачивается на основании реестра владельцев Облигаций (далее – реестр) для целей выплаты дохода, сформированного депозитарием Банка, владельцам Облигаций, являющимся таковыми по состоянию на дату формирования реестра. Даты формирования реестра, а также порядок определения таких дат, в случае если установленная дата выпадает на нерабочий день, указаны в пункте 18 настоящего документа.

Доход выплачивается в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь путем перечисления причитающихся денежных средств:

в долларах США – на указанные в реестре счета владельцев Облигаций, открытые в валюте номинала Облигации;

в белорусских рублях по обменному курсу покупки долларов США, установленному в Центральном аппарате Банка на день выплаты дохода (на момент оформления необходимых платежных документов), – на указанные в реестре счета владельцев Облигаций, открытые в белорусских рублях.

В случае отсутствия в реестре данных о счетах владельцев Облигаций, а также в случае, если реестр содержит ошибочные банковские реквизиты, сумма, подлежащая выплате, депонируется на счете Банка и выплачивается после письменного обращения владельца Облигаций. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

**17. Период начисления дохода по облигации**

Доход по Облигациям начисляется в период с 01.04.2016 по 01.04.2018 (с даты, следующей за датой начала размещения Облигации, по дату начала погашения Облигации) включительно.

Доход за первый период начисляется с даты, следующей за датой начала размещения Облигации, по дату его выплаты включительно. Доход по остальным периодам, включая последний, начисляется с даты, следующей за датой выплаты дохода за предшествующий период, по дату выплаты дохода за соответствующий период начисления дохода (в последнем периоде – по дату погашения) включительно.

**18. Даты выплаты дохода. Даты формирования реестра владельцев облигаций для целей выплаты дохода**

Доход по Облигациям выплачивается в дату окончания соответствующего периода начисления дохода:

| № п/п | ПЕРИОД НАЧИСЛЕНИЯ ДОХОДА: начало периода | конец периода, дата выплаты дохода | продолжительность периода, дней | Дата формирования реестра для целей выплаты дохода |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 01.04.2016 | 01.07.2016 | 92 | 27.06.2016 |
| 2 | 02.07.2016 | 01.10.2016 | 92 | 27.09.2016 |
| 3 | 02.10.2016 | 01.01.2017 | 92 | 28.12.2016 |
| 4 | 02.01.2017 | 01.04.2017 | 90 | 28.03.2017 |
| 5 | 02.04.2017 | 01.07.2017 | 91 | 27.06.2017 |
| 6 | 02.07.2017 | 01.10.2017 | 92 | 27.09.2017 |
| 7 | 02.10.2017 | 01.01.2018 | 92 | 28.12.2017 |
| 8 | 02.01.2018 | 01.04.2018 | 90 | 28.03.2018 |
| ИТОГО: | | | 731 | |

В случае если дата выплаты дохода выпадает на нерабочий день, фактическая выплата дохода осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты на сумму дохода по Облигациям за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.

Под нерабочими днями в настоящем документе понимаются выходные дни, государственные праздники и праздничные дни, установленные и объявленные Советом Министров Республики Беларусь, Президентом Республики Беларусь нерабочими днями, а также установленные в ином государстве – в случае перечисления дохода через банк-корреспондент, расположенный в данном государстве.

В случае если дата формирования реестра для целей выплаты дохода выпадает на нерабочий день, установленный в Республике Беларусь, фактическое формирование реестра осуществляется в последний рабочий день, предшествующий нерабочему дню.

**19. Условия и порядок досрочного погашения (аннулирования) облигаций**

19.1. Банк осуществляет досрочное погашение Облигаций по требованию владельца Облигаций в случае несогласия владельца Облигаций с принятым Банком решением о замене предмета залога по настоящему выпуску Облигаций либо принятым Банком решением о замене обеспечения исполнения обязательств по Облигациям на иной вид обеспечения.

Владелец Облигации вправе потребовать осуществления Банком досрочного погашения Облигаций в срок не позднее одного месяца с даты публикации информации о замене обеспечения на официальном интернет-сайте Банка (http://belarusbank.by).

Для целей досрочного погашения Облигаций по требованию владельцев Облигаций, депозитарий Банка формирует реестр по состоянию на рабочий день, следующий за днем истечения срока для предъявления Облигаций к досрочному погашению. Досрочное погашение Облигаций осуществляется Банком в отношении лиц, подавших заявление и указанных в реестре, через 4 рабочих дня после даты формирования реестра.

19.2. Правлением и Наблюдательным советом Банка может быть принято решение о досрочном погашении Облигаций (части настоящего выпуска Облигаций), находящихся в обращении. О данном решении Банк письменно уведомляет владельцев Облигаций не позднее 4 рабочих дней до установленной даты досрочного погашения Облигаций.

Досрочное погашение Облигаций по решению Банка осуществляется Банком в отношении лиц, указанных в реестре, который формируется депозитарием Банка за 4 рабочих дня до установленной Банком даты начала досрочного погашения Облигаций.

19.3. При досрочном погашении Облигаций владельцам Облигаций выплачивается их номинальная стоимость, а также доход, рассчитанный с даты, следующей за датой выплаты дохода за предшествующий период, по дату начала досрочного погашения включительно.

Досрочное погашение Облигаций осуществляется в безналичном порядке в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь путем перечисления причитающихся денежных средств:

в долларах США – на указанные в реестре счета владельцев Облигаций, открытые в валюте номинала Облигации;

в белорусских рублях по обменному курсу покупки долларов США, установленному в Центральном аппарате Банка на день выплаты дохода (на момент оформления необходимых платежных документов), – на указанные в реестре счета владельцев Облигаций, открытые в белорусских рублях.

19.4. В соответствии с законодательством Республики Беларусь владельцы Облигаций обязаны осуществить перевод досрочно погашаемых облигаций на счет «депо» Банка не позднее рабочего дня, следующего за днем перечисления Банком денежных средств, необходимых для досрочного погашения облигаций.

19.5. Банк может принять решение об аннулировании досрочно погашенных Облигаций и/или Облигаций, не размещенных Банком на момент принятия такого решения.

**20. Порядок погашения облигаций**

При погашении Облигаций владельцам Облигаций выплачивается номинальная стоимость Облигаций, а также доход за последний период начисления дохода (иные неполученные доходы – при их наличии).

Погашение Облигаций осуществляется Банком в отношении лиц, указанных в реестре для целей погашения Облигаций, который формируется депозитарием Банка по состоянию на 28.03.2018. В случае если день погашения выпадает на нерабочий день, погашение осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты на сумму погашения за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.

Погашение Облигаций осуществляется в безналичном порядке в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь путем перечисления причитающихся денежных средств:

в долларах США – на указанные в реестре счета владельцев Облигаций, открытые в валюте номинала Облигации;

в белорусских рублях по обменному курсу покупки долларов США, установленному в Центральном аппарате Банка на день выплаты дохода (на момент оформления необходимых платежных документов), – на указанные в реестре счета владельцев Облигаций, открытые в белорусских рублях.

В соответствии с законодательством Республики Беларусь владельцы Облигаций обязаны осуществить перевод погашаемых Облигаций на счет «депо» Банка не позднее рабочего дня, следующего за днем перечисления Банком денежных средств, необходимых для погашения Облигаций.

**21. Условия и порядок приобретения облигаций эмитентом до даты начала их погашения**

Приобретение Облигаций до даты начала их погашения не осуществляется.

**22. Порядок обращения облигаций**

Обращение Облигаций осуществляется среди Физических лиц в установленном законодательством Республики Беларусь порядке.

Сделки с Облигациями на вторичном рынке осуществляются резидентами Республики Беларусь – в торговой системе Биржи и/или на внебиржевом рынке, нерезидентами Республики Беларусь – только в торговой системе Биржи.

Сделки с Облигациями на вторичном рынке прекращаются со дня формирования реестра владельцев Облигаций для целей погашения Облигаций, указанного в пункте 18 настоящего документа.

Первый заместитель
Председателя Правления
Открытого акционерного общества
«Сберегательный банк «Беларусбанк» Г.С.Господарик

Главный бухгалтер
Открытого акционерного общества
«Сберегательный банк «Беларусбанк» И.П.Лысоковская

Директор
Унитарного предприятия
по оказанию услуг на рынке ценных бумаг
«АСБ БРОКЕР» В.С.Санкович

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*

# ПРЫДЗВІНСКІЯ «ФІШКІ»

## Дзе самыя спрытныя «Паштовыя кур'еры» і хто стане аўтарам «чароўных лістоў»?

**Сёлета паштавікі Віцебшчыны працягнуць развіццё як традыцыйных паслуг, так і параўнальна новых. Адпавядаць патрабаванням часу — неабходнасць ва ўмовах з'яўлення на рынку канкурэнтаў. Але, бясспрэчна, з «Белпоштай» змагацца за кліентаў складана. Бо прадпрыемства мае велізарны вопыт і добрую рэпутацыю.**



Мне ўжо за 40 гадоў, а нядаўна на пошце зразумеў, што многага не ведаю. А вы, напрыклад, карысталіся паслугай «Паштовы кур'ер»? І, напэўна, толькі моладзь у курсе нюансаў посткросінгу.

— Дарэчы, на Віцебшчыне «Паштовы кур'ер» вельмі папулярная паслуга. Мы па яе аказанні лідзіруем у краіне. Трэба толькі патэлефанаваць ці адправіць заяўку праз інтэрнэт. А ўсё астатняе зробіць пошта. Ды яшчэ на выгадных для вас умовах. Наконт посткросінгу, маеце рацыю — моднае хобі. І гэта не толькі «прывітанне» ад іншаземца, але і паралельна гісторыя іншай краіны, культурная спадчына. А якая цудоўная магчымасць пашырыць свае геаграфічныя, тэарэтычныя веды ў розных кірунках! Мы актыўна супрацоўнічаем з навучальнымі ўстановамі, бо многія хлопцы і дзяўчаты гэтым захапляюцца, — распавядае «Звяздзе» **Кацярына ЗІНКЕВІЧ, намеснік дырэктара Віцебскага абласнога філіяла РУП «Белпошта».**

А паслуга «EMS Belpost» — экспрэс-дастаўка тавараў і грузаў па краіне, бадай, заслугоўвае асобнага артыкула. Ёй карыстаецца ўсё больш кліентаў. І з улікам іх пажаданняў яна будзе ўдасканаленай. Паштавікі Прыдзвінскага краю будуць развіваць і запатрабаваныя паслугі інтэрнэт-крамаў. Там можна заказаць тавары прыкладна 170 беларускіх прадпрыемстваў.

— Адзін з прыярытэтаў нашай дзейнасці — прыцягненне для абслугоўвання яшчэ больш інтэрнэт-крамаў, юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў. Дарэчы, толькі «Белпошта» аказвае паслугі накладной платы. У тым ліку ў Расію. Магчымая экспрэс-дастаўка тавараў у прыблізна 23 тысячы населеных пунктаў краіны, а таксама ў 200 краін свету! — працягвае Кацярына Зінкевіч.

Сёлета атрымаюць далейшае развіццё дадатковыя сэрвісы існуючых паслуг. Сярод іх «Камфорт» і адпраўленні 1 Клас, дастаўка дакументаў, пасылак і дробных пакетаў на дом.

На працягу года на Віцебшчыне паштавікі правядуць розныя акцыі. У прыватнасці, абласны конкурс дзіцячага малюнка «Мой чароўны ліст». Запланавалі і сумесныя акцыі з прадпрыемствамі вобласці па перасылцы так званых акцыйных фішак (умоўных таварных знакаў).

Пашырыцца сетка аб'ектаў паштовай сувязі. Плануецца адкрыць новае мадэрнізаванае аддзяленне сувязі ў Полацку.

— Наогул сучасныя аддзяленні паштовай сувязі — гэта ў першую чаргу сувязныя цэнтры. Яны сярод іншага забяспечваюць бесперапынную працу буйных прадпрыемстваў і індывідуальных прадпрымальнікаў. І арыентацыя на бізнес-кірунак — не выпадковы выбар. На сёння ўжо функцыянуюць 8 бізнес-паштаў. Яны абслугоўваюць выключна юрыдычных асоб і ІП. Спецыялісты па продажы паслуг хутка і з улікам спецыфікі дзейнасці падбяруць найбольш выгаднае рашэнне для вядзення бізнесу, — падкрэсліла суразмоўца.

Пасля размовы дзеля інтарэсу паглядзеў сайт «Белпошты». Сярод іншага цікава было прачытаць водгукі кліентаў. «Выказваю ўдзячнасць работнікам, якія прымаюць паскораную пошту, за добразычлівасць, выразную кансультацыю па пытаннях работы з адпраўленнямі!» — напісала жыхарка Віцебска. «Хачу выказаць вялікую падзяку супрацоўніку АПС Шуміліна-2 Баравіковай Т.Н. за добрае стаўленне да пажылых людзей. З цяплом, клопатам, павагай ставіцца да сваёй працы, даходліва тлумачыць, дапамагае сваім кліентам», — шчырая падзяка з райцэнтра Шуміліна. Адна з кліентак нават верш прысвяціла начальніку аддзялення паштовай сувязі. Такія словы, як кажуць, многага вартыя.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*pukshanski@zviazda.by*

■ Жыццёвінкі

# ПА СВАІМ МАРШРУЦЕ...

Ёсць у нашых людзей такая звычка: казаць, папаўняючы гардэроб новым касцюмам, або, як у выпадку з жанчынамі, сукенкай ці модным жакецікам (пералічваць рэчы можна доўга): «Гэта на выхад». Маецца на ўвазе — на выхад у госці, у тэатр ці проста ў горад. На людзі, адным словам. А калі такі выхад не надарыцца — што тады? Касцюм той так і правісіць, ніводнага разу не апрануты, акрамя, вядома, таго, што быў падчас прымеркі?

«На выхад» — пагадзіцеся, нешта ёсць у гэтых простых на першы погляд словах, што падкрэслівае нашу ашчаднасць, беражлівасць і... значнасць. Бачыце, у мяне новы касцюм, так што, спадарства, дазвольце на вас паглядзець і сябе паказаць. Урачыстасць моманту прысутнічае, і ад гэтага нікуды не дзенешся.

Гадоў колькі назад мая вясковая суседка цётка Ганна адзначыла сямідзесяцігоддзе. Сабраліся дзеці, павіншавалі маці, шчодра адарылі зусім не таннымі падарункамі. Старая потым хвалілася суседкам, якія збегліся на другі дзень, каб паглядзець, на што варты яе дзеці — ці не скупыя? Паказваючы падарункі, імянінніца каменціравала:

— Гэтую квятастую хустку Надзя прывезла. Прыгожая ж, праўда? Туфелькі — ад Мішы. Мякенькія, лёгенькія. Хоць у танец пускайся. У-ух! Спадніцу Маруська прывезла. Новенькая, яшчэ нават з этыкеткай была, я сама адарвала. Можа, думала дзеўка, малая будзе, то прадам каму. Дзякуй дзецям, не забыліся. Цяпер у мяне ёсць усё на выхад...

Ніхто не прыгадае, ці апранула хоць раз тыя падарункі сваіх дзяцей суседка. Мабыць, не. Мабыць, не было куды ёй выйсці ў такім вось убранні. Ды і куды прыгожа апранешся ў вёсцы? У хлеў да каровы? У краму хіба, калі хлеб прывозяць? Але ж засмяюць: ты куды гэта, скажуць, Ганна, прыбралася? Але добра запомнілі жанчыны-суседкі: калі хавалі Ганну, усё, чым яна хвалілася, было на ёй. І хустка, і туфелькі, і спаднічка...

Тое быў яе выхад. Апошні. Дачакалася...

* * *

Лідзія Восіпаўна жыве з дачкой Таццянай, муж пакінуў іх даўно, упадабаў іншую жанчыну, і таму ўвесь галоўны клопат па выхаванні дзяўчынкі лёг на плечы маці. Тая і старалася, як магла: заўсёды апранала Танюшу так, каб выглядала не горш, чым у поўных сем'ях, а можа, яшчэ лепш. Пакуль жылі старыя, не забываліся пра ўнучку і яны. Асабліва спатрэбілася іх дапамога, калі Таццяна вырасла і паступіла на факультэт замежных моў мясцовага ўніверсітэта. Трэба адзначыць, што замежныя мовы Таццяне даваліся лёгка, і ўжо на пятым курсе яна свабодна валодала англійскай і французскай. Папрацавала пасля заканчэння вучобы некалькі месяцаў у школе, а потым уладкавалася — без асаблівых праблем — у турыстычную фірму гідам.

Здавалася б, толькі і радавацца маці, а яна бядуе, скажа іншы раз то адной сяброўцы, то другой:

— Засядзелася ў дзеўках мая Танька. Не ведаю нават, ёсць у яе хто ці не. Толькі спытаю пра гэта, а яна адразу: «Ай, адстань, мама!» Калі ж размаўляе па тым скайпе са сваімі жаніхамі не па-нашаму, я нічога не разумею. Вывучыла на сваю галаву!..

* * *

Пра сваіх суседзяў — галубоў — вядучы майстра сцэны Гомельскага абласнога драматычнага тэатра Аляксандр Лаўрыновіч можа расказваць доўга.

— Ледзь толькі адчыню акно, яны тут як тут, — гаворыць ён. — І што цікава, быццам і не бачаць іх перад гэтым... Значыць, сочаць за маім акном, так атрымліваецца... А бывае, апісваю кругі над скрыжаваннем вуліцы Сялянскай і праспектам Леніна, паблізу ад майго дома, я бачу гэта, але не паказваюся. Потым мне робіцца шкада птушак, і я заяўляю пра сябе. Чым кармлю? Побач жа гарадскі рынак, хаджу колькі разоў на месяц з торбачкай, куплю зерне — у асноўным проса. Проса яны любяць. Нічога, не пабядняем мы з Люсяй (Людміла Корхава, народная артыстка Беларусі), няхай сілкуюцца. Асабліва стараюся падтрымаць іх узімку, калі карміцца галубам няпроста. Нясу «выдаткі» я толькі ў адным, калі гэта можна так назваць: часлеі, чым трэба, мыю падаконнік. А ён жа ў мяне вунь які — з казырком на ўсю кватэру. Затое, калі іду з рэпетыцый, трохі стомлены, бывае, ды і не ў лепшым настроі, варта паглядзець на птушак, якія, здалёк запрыкмеціўшы мяне, табуняцца каля акна, — настрой адразу робіцца добрым. Жывыя ж істоты мы, што ты хочаш: і яны, як і чалавек, ведаюць, дзе ласка, пяшчота і дабрыня, а дзе — жорсткасць, нахабства, абыякавасць...

У той дзень мы разам убачылі галубоў — якраз Аляксандр падыходзіў да свайго дома, туды ж падляталі і птушкі.

— Чакаюць, — з нейкім непрыхаваным гонарам кіўнуў Аляксандр Сафронавіч і падаў руку на развітанне: яго чакалі галубы.

І ён заспяшаўся да іх.

* * *

У цудоўным апавяданні Міхася Стральцова «На чацвёртым годзе вайны» ёсць наступныя радкі: «Бабуля — высахлая, з учарнелым ад работы і старасці тварам — адсцябала матузамі малога ўнука за тое, што паабшчыпваў, не дачакаўшыся вячэры, акрайчык ацеслівага, спечанага з бульбы і ячменных шароек хлеба».

Не помню ўжо добра, чым адсцябала мяне бабуля Пелагея, калі я нейкім чынам сціброў перад яе пільным вокам акраец хлеба і вынес яго за вугал хаты, дзе мяне ўжо чакаў Васька Мурашоў, трохі старэйшы за мяне хлапец. Вось такі час быў: кожная крошка бралася ў сям'і на ўлік, інакш, магчыма, і не выжылі б. Скажы сёння пра гэта сваім сынам ці ўнукам — хіба павераць?

Не ведаю, ці помніў пра той выпадак Васька Мурашоў, неяк я пра гэта не пытаўся, а сёння — позна: няма ўжо яго на гэтым свеце.

Не ўсе ваенныя і пасляваенныя хлопцы пражылі доўга, на вялікі жаль: ім, мусіць, у свой час не хапіла тых самых хлебных крошак, за якія адсцябала бабуля свайго ўнука ў апавяданні Міхася Стральцова, за што і я атрымаў ад сваёй трапкача. Не хапіла — каб набрацца моцы, зрабіць трывалы жыццёвы падмурак.

Тады ж, у пасляваенны час, у вёсках нарадзілася і слова «варгольы». Падзяліце яго на два: на назоўнік «вар» і прыметнік «голы». Цудоўнае на першы погляд слова, прыгожае, толькі аддае нішчымніцай...

* * *

Сем гадоў, пражытых у Ашхабадзе, не выкрасліш з жыцця. Многае засталося ў памяці і, пэўна, надоўга. На той час існаваў СССР, а першым сакратаром ЦК Туркменістана быў Мухамедназар Гапуравіч Гапураў. Высокі, падцягнуты, заўсёды педантычны, разважлівы. Я яго ведаў па шматлікіх здымках у газетах і дзякуючы тэлебачанню, а таксама бачыў на трыбуне — калі ў Ашхабадзе, як і паўсюдна, шырока і ўрачыста адзначалася гадавіна Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, я чаканіў крок у афіцэрскай калоне і касіў адным вокам на кіраўніка рэспублікі...

Некалькі гадоў таму я пабываў у сталіцы сонечнага Туркменістана, прагуляўся па заценены вуліцах горада. На адной з іх сустрэў старога туркмена, які нетаропка ішоў насустрач, быў у карычневым касцюме і такога ж колеру капелюшы. І тут я аслупянеў у прамым сэнсе гэтага слова — насустрач мне ішоў... не хто-небудзь, а сам Гапураў. Я не разгубіўся — павітаўся. Ён адказаў, змерыў мяне уважлівым позіркам, і можа б адразу пакрочыў далей, калі б не мая настырнасць: «Прабачце, вы не Гапураў?» — «Так, я. А хто вы?»

Усяго некалькі хвілін мы пагаварылі, але я паспеў расказаць яму пра Беларусь і крышачку пра сябе, пацікавіўся, чым займаецца цяпер вядомы ў рэспубліцы (і, пераканаы, далёка за яе межамі) пенсіянер, і развіталіся. Найбольш запомнілася мне тое, што ён вельмі цёпла адазваўся пра Беларусь і беларусаў. Быў шчыры і я, бо туды, дзе табе было некалі кепска і няўтульна, не вяртаюцца...



Фота Анатоля КЛЯШЧУКА.

* * *

Самыя розныя выпадкі здараюцца ў дарозе. Самыя розныя...

Калі быў вучнем Ісканскай васьмігодкі, то ў Быхаўскай раённай газеце «Маяк Прыдняпроўя» прачытаў вельмі кароткую нататку, але запомніў яе на ўсё жыццё. Называлася яна «Чалавек — чалавеку». І была вось аб чым. Аўтобус падыходзіў да прыпынку «Вараніно», а якраз у гэты час ад «Вараніно» адышоў рэйсавы на Магілёў.

— Ай-я-яй! Якую б адну хвіліну — і я б паспела! — захвалявалася адна з пасажырак. — А ў мяне ж другая змена на фабрыцы — магу спазніцца. Што ж рабіць, а? У маці была, бульбу ёй выкапала. Усё роўна дзве баразны засталіся, магла б раней выбрацца. Ці не дурніца, а? — Жанчына кідала кароткія позіркі на людзей,нібыта шукала ў іх не толькі дапамогі, але і спагады: — Ай-я-яй!...

Вадзіцель раптам павярнуўся тварам да пасажыраў:

— Ну што, выручым жанчыну?

— Канешне! — амаль аднагалосна адказалі тыя.

І вадзіцель дабавіў «газу», хоць яму і трэба было рабіць паварот налева, і неўзабаве заехаў наперад магілёўскаму аўтобусу — тая жанчына спакойна перасела на яго...

Гэтай жа гісторыі быў сведкам я сам. І няхай яна крышачку з «перчыкам», аднак выхадка вадзіцеля амаль усім спадабалася, той-сёй нават запляскаў у далоні. На заднім сядзенні двое мужчын рашылі выпіць па сто грамаў. За сустрэчу, відаць. Адкаркавалі бутэльку, а ў шклянку наліць не атрымліваецца — дарогі тады былі яшчэ не так добра-гладка выштукаваны: расплёскваюцца кроплі, як ты ні старайся.

Раптам аўтобус сцішыў ход, а потым і зусім спыніўся. Вадзіцель, паглядзеўшы ў сваё люстэрка, у якім бачыў выпівох, сказаў даволі карэктна, хоць і гучна:

— Выпіце, мужыкі, а то паразліваеце!..

Я таксама, здаецца, паапладзіраваў шаферу — за клопат пра сваіх пасажыраў... Ды і народ ён крышачку павесяліў. А лішніх усмешак на тварах у людзей не бывае...

* * *

Сцяпан Сцяпанавіч гадоў колькі назад адпачываў у адным з санаторыяў Беларусі. За адным сталом з ім сядзелі тры жанчыны. Адну з іх запомніў ці не на ўсё жыццё: гарадская, з выгляду так нічога і заўсёды знойдзе што сказаць, параіць. Паколькі ў тым санаторыі адпачывалі ў асноўным людзі паважанага веку,то і ўзрост яе па сталe Сцяпана Сцяпанавіча было гадоў пад семдзесят — не меней. Яна мала расказвала пра сябе, больш пра дзяцей і ўнукаў: якія яны ў яе малайцы — вы толькі б ведалі! Ну, а хто ў нас пра сваіх дзяцей на людзях будзе абы што казаць? Справа вядомая.

Кожны раз, падсілкаваўшыся ў сталоўцы, яна несла з сабой у нумар што-небудзь з ежы: гэта — коціку, гэта — сабачку, гэта — суседцы, бо захварэла. І так з дня ў дзень.

Ад'язджала тая гарадская краля на дзень раней тэрміну, надзвычай паспешліва, а рэчы да аўтобуса папрасіла памагчы аднесці двух іншых суседак па стале. Прыйшоўшы на вячэру, тыя не пераставалі здзіўляцца: а што гэта яна павезла ў сваіх торбах, бо ледзьве дапёрлі ўтрох? Хіба цаглiны якія?

Сцяпан Сцяпанавіч часта ўспамінае пра той выпадак з цяжкімі торбамі і шкадуе, што іншы раз «добрая мысля прыходзіць апасля». Хоць, мусіць жа, жанчыны і самі здагадаліся аб усім ды не хацелі яму гаварыць... Бо сапраўды ж — ніводнага разу яны не бачылі, каб тая кабета хоць нешта з узятага посуду прынесла назад у сталоўку...

**Васіль ТКАЧОЎ**

■

# У ЧАКАННІ «БРЭКСІТУ»

## Пытанне наконт выхаду Вялікабрытаніі з ЕС застаецца адкрытым



У канцы мінулага тыдня Нацыянальнае бюро статыстыкі Вялікабрытаніі абвясціла, што за год «сальда» мігрантаў у краіне вырасла на 323 тысячы чалавек. Больш за палову гэтай колькасці (172 тыс.) — тыя, хто пераехаў сюды з іншых краін Еўрасаюза. Гэта адзін з рэкордных паказчыкаў за апошні час. Відавочна, што такія красамоўныя лічбы могуць дадаць аргументаў прыхільнікам выхаду з ЕС. Менавіта мігранты з краін ЕС і сацыяльная дапамога ім з'яўляюцца адным з галоўных, калі не ключавым пытаннем рэферэндуму пра членства Брытаніі ў Еўрасаюзе, які мае адбыцца 23 чэрвеня. Сітуацыя цяпер выглядае вельмі неадназначна, прычым яна змяняецца. Дык ці адбудзецца той самы «брэксіт» і чым ён такі непрыемны для Старога Свету?

### СВАЯ КАЛЯІНА

Пачыналася ўсё амаль шэсць дзесяцігоддзяў таму. У 1957-м, калі была створана Еўрапейская эканамічная супольнасць (ЕЭС — адзін з папярэднікаў сучаснага ЕС), Вялікабрытанія адмовілася далучыцца да яе, бо лічыла, што вялікую эканамічную выгаду прынясе гандаль з краінамі брытанскай Супольнасці і ЗША. Аднак у 1973-м на фоне паспяховага развіцця ЕЭС краіна ўсё ж уступіла ў яго.

Разам з тым, Вялікабрытанія імкнулася захаваць максімальную незалежнасць у эканамічных і палітычных пытаннях. Напрыклад, краіна не далучылася да найбуйнейшых інтэграцыйных праектаў ЕС — да зоны еўра (існуе з 1999 г.) і да Шэнгенскіх пагадненняў, што прадугледжваюць скасаванне візавага кантролю на агульных межах (набылі моц у 1995 г.). Апроч таго, Вялікабрытанія не падпісала Бюджэтны пакт (2013 г.), які накіраваны на правядзенне краінамі ЕС узгодненай падатковай і бюджэтнай палітыкі.

У 2011-м ва ўмовах эканамічнага крызісу ў Вялікабрытаніі ўзмацнілася незадаволенасць знаходжаннем краіны ў арганізацыі. У парламент была накіравана прапанова ініцыятыўнай групы аб правядзенні рэферэндуму пра выхад з Еўрасаюза. Аднак тады дэпутаты палічылі яго несвоечасовым. У пачатку 2013 года прэм'ер-міністр Дэвід Кэмеран прапанаваў правесці рэферэндум, калі на выбарах у 2015-м Кансерватыўная партыя на чале з ім здабудзе перамогу. Адзін з фактараў, што паўплывалі на такое рашэнне, быў звязаны з бояззю магчымага адтоку галасоў на карысць Партыі незалежнасці Злучанага Каралеўства, якая прытрымліваецца цвёрдых антыеўрапейскіх поглядаў. Пасля таго як па выніках выбараў, якія адбыліся 7 мая 2015 года, кансерватары заваявалі абсалютную большасць і сфарміравалі аднапартыйны ўрад, палажэнне пра рэферэндум было занесена ў праграму новага кабінета міністраў. Летась у чэрвені пераважная большасць дэпутатаў парламента выказалася за рэферэндум. Сам прэм'ер лічыць, што краіна павінна застацца ў складзе ЕС, але пры ўмове рэфармавання арганізацыі.



У Вялікабрытаніі неаднаразова ўзнікалі нязгоды з партнёрамі па Еўрасаюзе. У прыватнасці, у верасні мінулага года падчас экстраннай сустрэчы кіраўнікоў МУС ЕС, прысвечанай міграцыйнаму крызісу ў Еўропе, гэтая дзяржава заявіла, што «не возьме ўдзелу ў сістэме ЕС па размеркаванні мігрантаў, а будзе прымаць бежанцаў напрамую з лагераў у Сірыі».

У лістападзе 2015 года Дэвід Кэмеран накіраваў старшыні Еўрапейскага савета Дональду Туску ліст з прапановамі па рэфармаванні ЕС. Маўляў, пры ўмове іх выканання краіна не выйдзе з арганізацыі. Паводле ініцыятывы брытанскага прэм'ера, змены павінны датычыцца чатырох сфер: эканомікі, канкурэнтаздольнасці, пытанняў узмацнення суверэнітэту Вялікабрытаніі і міграцыі. Блок эканамічных пераваг самы шырокі. У прыватнасці, прадугледжвалася, што для краін, якія не ўваходзяць у еўразону, галоўным фінансавым рэгулятарам павінен быць не Еўрапейскі цэнтральны банк, а нацыянальныя банкі. Таксама гэтыя дзяржавы не бяруць удзел у аперацыях па выратаванні еўра. Рынкі Вялікабрытаніі і іншых краін, што не ўваходзяць у зону еўра, павінны быць абаронены. А вырашэнне пытанняў, што датычацца ўсіх краін-членаў, павінна прымацца кансенсусам (у ЕС па розных кірунках агульнай палітыкі дзейнічаюць розныя працэдуры галасавання).

Для павышэння канкурэнтаздольнасці Еўрасаюза Дэвід Кэмеран, у прыватнасці, патрабаваў зменшыць адміністрацыйны ціск на бізнес з боку ЕС. У якасці мер па ўмацаванні суверэнітэту Вялікабрытаніі брытанскі прэм'ер-міністр прапанаваў вызваліць краіну ад абавязкаў брацць удзел у далейшым збліжэнні краін — членаў саюза і ўзмацніць ролю нацыянальных парламентаў.

Для вырашэння міграцыйных праблем Дэвід Кэмеран лічыць патрэбным увесці правіла, па якім мігранты з краін ЕС, якія прыязджаюць працаваць у Вялікабрытанію, цягам чатырох гадоў не будуць мець права на атрыманне дапамогі. Таксама ён мяркуе, што прынцып свабоды перамяшчэння не павінен ужывацца для грамадзян новых краін — членаў ЕС, пакуль іх эканомікі не наблізяцца да ўзроўню «старых» дзяржаў.

### ЦЯЖАР ДЛЯ КАРАЛЕЎСТВА

Умовы, выказаныя Лонданам, абмяркоўваліся ў ЕС на розных узроўнях, у тым ліку і на саміце ў снежні 2015 года. А вырашылася ўсё зусім нядаўна — 19-20 лютага ў Брусэлі сабраліся краіны — члены ЕС, каб прыняць рашэнне, якое пасля некаторыя эксперты назавуць насамрэч гістарычным. На ўсеагульную думку, самітаў, што праходзілі ў такім драматычным становішчы, у Еўропе яшчэ не было. Крызіс з мігрантамі, а таксама жорсткая і крывавая барацьба з міжнародным тэрарызмам перакачавалі ў 2016-ты з года мінулага. Цяпер да іх дадалася не менш вострая, прынамсі, на гэты момант, праблема — «брэксіт» (па-англійску «brexit»). Так па аналогіі з патэнцыйным выхадам Грэцыі з аб'яднанай Еўропы («грэксітам»), які бударажыў увесь кантынент першую палову мінулага года, завуць цалкам магчымы выхад Вялікабрытаніі.

Тон трывожным чаканням задаў прэзідэнт Еўрапейскага савета Дональд Туск. Напярэдадні саміту ён здзейсніў свайго роду бліцкрыг і наведаў за 24 гадзіны сталіцы пяці еўрапейскіх дзяржаў. У Парыжы, Бухарэсце, Афінах, Празе і Берліне ён угаворваў лідараў гэтых краін пайсці на кампраміс з Вялікабрытаніяй. Вядома, адзінага меркавання тут проста быць не магло. Але было імкненне прыйсці да пэўнай згоды, паколькі, як кажуць, сітуацыя абавязвае. «У кожнага тут будзе свая драма, а ў канцы мы пра ўсё дамовімся», — гэты афарыстычны прагноз прэзідэнта Літвы Далі Грыбаўскайтэ адносна ходу і выніку саміту працытавалі, пэўна што, усе вядомыя еўрапейскія выданні. Што самае цікавае, практычна так у рэшце ўсё і адбылося. Як заўважаюць аналітыкі, Брусэлю давядзецца яшчэ доўга разблытваць наступствы лютаўскага саміту ЕС. Любымі спосабамі спрабуючы захаваць Вялікабрытанію ў Еўрасаюзе, еўрапейскія лідары паставілі пад пытанне саму будучыню еўраінтэграцыі.



Брытанскія ўлады традыцыйна ставіліся да ЕС як да няўхільнага зла, да якога давялося далучыцца ў 1970-х дзеля забеспячэння эканамічнага росту. «Мне ніколі не падабаўся Брусэль і мне не падабаецца Еўрасаюз, але тое, што арганізацыя выклікае раздражненне, не значыць, што яна не прыносіць выгады», — заўважае Дэвід Кэмеран. Але, на яго думку, ЕС у цяперашнім выглядзе стаў цяжарам для Злучанага Каралеўства. Першае — у палітычным плане. Брытанскія ўлады адмаўляюцца ад канцэпцыі глыбокай інтэграцыі, не жадаючы губляць сваю незалежнасць. Кэмеран запэўнівае, што ЕС павінен жыць па прынцыпе «Еўропа — дзе трэба, нацыянальнае — дзе магчыма». Другое, у эканамічным аспекце — наплыў шматлікіх працоўных мігрантаў з краін Усходняй Еўропы стаў сур'ёзным выклікам для брытанскай «сацыялкі».



Дэвід Кэмеран запатрабаваў ад Еўрасаюза перагледзець умовы брытанскага членства ў арганізацыі. «Я не люблю Брусэль, я люблю Брытанію, — заявіў ён па выніках напружаных перамоў. — Мая праца — гэта зрабіць усё, што ў маіх сілах, каб адстаяць нашы інтарэсы». І ў ходзе амаль 30-гадзінных перамоў ён здабыў практычна поўную перамогу.

У палітычным сэнсе Лондану дазволілі адмовіцца ад далейшай еўраінтэграцыі. «Вялікабрытанія будзе назаўжды выведзена з-пад дзеяння прынцыпу пра «ўсё цяснейшы саюз народаў Еўропы». І яна ніколі не далучыцца да еўразоны», — заявіў прэм'ер. Апроч таго, Вялікабрытанія дабілася для сябе асобных умоў наконт еўрапейскіх мігрантаў. «Мы ўстанавілі новы «аварыйны тормаз», у рамках якога мігрантам з ЕС давядзецца чакаць 4 гады, пакуль у іх будзе поўны доступ да прывілеяў. Гэта адказ на меркаванне пра тое, што людзі могуць прыехаць у нашу краіну і атрымаць штосьці проста так», — заявіў Кэмеран. Нарэшце, дапамогі на тых дзяцей мігрантаў, якія застаюцца ў краінах Усходняй Еўропы, будуць выплачвацца па ўсходнееўрапейскіх, а не па брытанскіх стаўках.

У выніку атрымалася, што Дэвід Кэмеран і еўрабюракраты, якія пагадзіліся выканаць яго патрабаванні, заклалі бомбу пад еўрапейскую інтэграцыю. Так, Кэмеран, як піша The Economist, абяцаў прытрымлівацца канцэпцыі «жыві і дай жыць іншым» — значыць, не замінаць краінам ЕС паглыбляць еўраінтэграцыю ў тым выпадку, калі яна не накладае дадатковыя абавязкі на Вялікабрытанію. Аднак праблема ў тым, што па гэтым шляху зараз услед могуць рушыць і іншыя дзяржавы.

### ЯДРО Ў КАЛЬЦЫ

Электарат Злучанага Каралеўства цяпер падзелены паміж трыма групамі, заўважаюць аналітыкі. Першую трэць складаюць тыя, хто хоча застацца ў ЕС незалежна ад сутнасці дамоўленасцяў паміж Брусэлем і Кэмеранам. Наступная група — гэта жыхары Злучанага Каралеўства, якія адназначна выступаюць за выхад з «антыбрытанскага» Еўрасаюза. «Давайце нарэшце пакінем ЕС, зноў установім кантроль над нашымі межамі і пачнём самі кіраваць сваёй краінай, а таксама перастанем пералічваць Брусэлю 55 мільёнаў фунтаў штодня», — кажа лідар UKIP (Партыі незалежнасці Злучанага Каралеўства) Найджэл Фарадж. Гэтай думкі прытрымліваецца сотня дэпутатаў ад Кансерватыўнай партыі, якія маюць намер агітаваць за выхад з ЕС, а таксама прынамсі шэсць міністраў і мэр Лондана Барыс Джонсан. Асноўная ж барацьба разгорнецца за апошнюю трэць — людзей, якія сумняваюцца.

Да чаго можа прывесці выхад Вялікабрытаніі з Еўрасаюза на практыцы? Калі каралеўства прыме такое рашэнне, то давядзецца скласці новую гандлёвую дамову з астатнімі ў ЕС 27 краінамі, каб брытанскія кампаніі маглі працягваць прадаваць свае тавары на еўрапейскім рынку, не сутыкаючыся з павышанымі тарыфамі і іншымі абмежаваннямі. Прыхільнікі выхаду лічаць, што Вялікабрытанія зможа дамовіцца пра «палюбоўны развод», што дазволіць ёй захаваць цесныя гандлёвыя стасункі з краінамі ЕС.

Аднак ёсць і іншыя выкладкі. Напрыклад, цэнтр эканамічнай эфектыўнасці пры Лонданскай найвышэйшай школе эканомікі лічыць, што пасля выхаду з ЕС валавы ўнутраны прадукт Вялікабрытаніі можа скараціцца ад 6,3% да 9,5% у год, што параўнальна з наступствамі глабальнага фінансавага крызісу 2008—2009 гадоў. У лепшым выпадку ВУП зменшыцца толькі на 2,2%, сцвярджаюць аўтары гэтага даследавання.

Выхад Брытаніі, лічыць Spiegel, можа стаць канцом аб'яднанай Еўропы. Прынамсі, у яе цяперашнім выглядзе. Еўраскептыцызм — не толькі брытанская «хвароба». Як паказваюць даследаванні, ёй пакутуюць і жыхары іншых еўрапейскіх краін. Давер да ЕС у такіх краінах, як Францыя і Германія, цяпер такі ж нізкі, як і ў туманным Альбіёне. Як перакананы шэраг экспертаў, Еўропа перажывае адзін з самых складаных і, магчыма, вырашальных перыядаў у сваёй гісторыі. Супакоіць брытанцаў і ўгаварыць іх застацца ў Еўрасаюзе ўжо недастаткова. Не выключана, што давядзецца прымаць нейкія радыкальныя меры, прыкладам, стварыць своеасаблівы «падвоены Еўрасаюз». У цэнтры кантынента можа аформіцца ядро ў складзе Францыі, Германіі і краін Бенілюкса са сваімі парламентам, урадам, валютай і войскам. Астатнія ж еўрапейскія краіны ўтвораць штосьці накшталт знешняга кальца, менш згуртаванага і інтэграванага.

Еўрапейская інтэграцыя, робяць выснову эксперты, можа працягваць існаваць толькі з дапамогай пераканання. Аднак рэальнасць значна больш складаная за выкладкі і сцэнарыі палітыкаў. Аб'яднаць еўрапейскія народы можна толькі шляхам прымусу ці грошай. Большасць аналітыкаў праўда мяркуе, што на брытанскім рэферэндуме пераможуць прыхільнікі ЕС. З іншага боку, не менш відавочна, што еўраскептыкі, як ніколі, моцныя і таксама маюць значныя шанцы на перамогу. Так што нельга выключаць магчымасць першага скарачэння Еўрасаюза пасля шасці дзесяцігоддзяў няўхільнага пашырэння.

Захар БУРАК. burak@zviazda.by

# ОАО «Технолит Полоцк»

**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 31 марта 2016 г. в 14.00 ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ по адресу: г. Полоцк, ул. Октябрьская, 47 (актовый зал ОАО «Технолит Полоцк»)**

**Повестка дня очередного общего собрания акционеров:**

1. Отчет директора общества об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2015 год. Утверждение показателей социально-экономического развития общества на 2016 год.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе в 2015 году.
3. О результатах аудита и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности общества за 2015 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках общества за 2015 год.
5. Утверждение распределения использования прибыли и убытков, выплате дивидендов за 2015 год.
6. Утверждение направлений распределения прибыли на 2016 год.
7. Об избрании членов наблюдательного совета, его составе и ревизионной комиссии общества.
8. Утверждение размера вознаграждений членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

С материалами по вопросам повестки дня собрания акционеры могут ознакомиться по адресу: **г. Полоцк, ул. Октябрьская, 47 (кабинет председателя наблюдательного совета) в рабочие дни (понедельник–пятница), начиная с 17.03.2016 г. по месту нахождения общества.**

УНП 300083521

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПОВТОРНЫХ ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества** | **ЛОТ №1.** Земельный участок, кадастровый номер 223681109901000043, площадью 0,2320 га, относящийся к категории земель населенных пунктов, садоводческих товариществ, дачных кооперативов, целевое назначение: для строительства и обслуживания жилого дома.<br>Первоначальная стоимость – **5 250 000** рублей |
| **Собственник (владелец) имущества** | Архипов Антон Васильевич |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Витебская область, Оршанский район, Высоковский с/с, д. Софиевка, ул. Ордишевская, 36 |
| **Информация об обременениях** | Без обременений |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Орша, ул. Островского, 36, каб. 2<br>15 марта 2016 года в 14.30 |
| **Справочная информация** | Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши<br>211391, г. Орша, ул. Островского, 36<br>Судебный исполнитель –<br>Слепцова Елена Алексеевна, тел. 80216543204 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в повторных торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши № 3642903000794 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 647, УНП 300002505 **не позднее 11.03.2016 г.**<br>Величина шага торгов – не менее 5% начальной стоимости выставленного на торги лота.<br>В соответствии с п. 6 ч.1 ст. 485 ГПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |

# Частное предприятие «Эволюция Бизнеса» проводит ПОВТОРНЫЕ открытые торги в форме аукциона по продаже имущества ЗАО «СтеклоБел», находящегося в ликвидации

| | |
|---|---|
| **Продавец:** | **ЗАО «СтеклоБел», г. Минск, пр. Партизанский, 8, тел. +375 17 389-72-27** |
| **Организатор торгов:** | **частное предприятие «Эволюция Бизнеса», телефон: +375 29 651 81 61** |
| **Место проведения торгов:** | **г. Минск, пр. Партизанский, 8, корп. 11** |
| **Дата и время проведения торгов:** | **15.03.2016 г. в 12.00** |
| **Срок подачи заявок:** | **по 11.03.2016 г. до 15.00** |
| **Порядок подачи заявок:** | принимаются организатором торгов по месту проведения торгов либо по адресу: 220023, г. Минск, а/я 14 |
| **Задаток:** | **участники для участия в аукционе допускаются без внесения задатка** |
| **Условия аукциона:** | 1. Шаг аукциона 5%. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов в течение 2 (двух) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.<br>2. Оплата стоимости приобретенного на аукционе предмета торгов осуществляется в следующем порядке: не позднее 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания договора купли-продажи победитель торгов обязан оплатить первую часть в размере 10 процентов от стоимости предмета торгов, вторую часть, в размере 90 процентов победитель торгов обязан будет оплатить не позднее 25 (двадцати пяти) рабочих дней с момента получения предмета торгов по накладной (ТН либо ТТН). Данные условия будут установлены в договоре купли-продажи предмета торгов между Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом.<br>3. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона. |

**Ознакомиться с предметом аукциона можно связавшись с продавцом либо с организаторм аукциона, тел. (+375 17) 389-72-27 (24); (+375 29) 651-81-61**

# Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

# ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЯ

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 3** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта** | Право заключения договора аренды помещений сроком 10 лет, общей площадью 575,0 кв.м, расположенных на первом и втором этажах здания по адресу: г. Гродно, ул. Буденного, 37 |
| **Начальная цена продажи** | 17 250 000 (семнадцать миллионов двести пятьдесят) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Коэффициент к базовой арендной величине по договору аренды** | - коэффициент 2,0; |
| **Условия аукциона** | Размещение на арендуемых площадях ресторана (кафе) |
| **Сумма задатка** | 1 725 000 (один миллион семьсот двадцать пять тысяч) белорусских рублей |
| **Продавец** | УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» объединенная станция Гродно, 230023, г. Гродно, ул. Буденного, 37, тел. 8-0152-73-43-52, факс 8-0152-72-24-58 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора аренды** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012000046251 в ф-ле № 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 152101752, УНП 500156921, ОКПО 01064077. Получатель – УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» объединенная станция Гродно |

**Аукцион состоится 25 марта 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
- *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
- *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
- *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

- представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
- физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
- представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 29.05.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 21 марта 2016 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

# Ликвидатор объявляет о продаже следующего имущества ДУП «ПМК-215» УП «Минскоблсельстрой» (УНП 690019233):

| № п/п | Наименование | Ед. изм. | Кол-во | Начальная цена с НДС, 20% |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Аппарат телефонный | шт | 2,000 | 180 000 |
| 2 | Балка настила | шт | 24,000 | 1 063 210 |
| 3 | Балки ж/б | м³ | 3,500 | 10 766 |
| 4 | Бачок оцинкованный | шт | 24,000 | 50 239 |
| 5 | Башмак | шт | 12,000 | 60 173 |
| 6 | Башмаки ж/б | м³ | 1,110 | 15 186 |
| 7 | Блоки г\с б\у обрезки. бой | м³ | 23,970 | 5 974 532 |
| 8 | Блоки газосиликатные б/у | м³ | 0,140 | 13 062 |
| 9 | Болт | кг | 15,400 | 64 528 |
| 10 | Боты диэлектрические | пар | 2,000 | 215 429 |
| 11 | Ванна б/у | шт | 1,000 | 362 537 |
| 12 | Вентрешетки | шт | 67,000 | 1 778 837 |
| 13 | Вибратор | шт | 2,000 | 1 540 373 |
| 14 | Вибратор б\у | шт | 5,000 | 3 431 494 |
| 15 | Воздухозборник б\у | шт | 1,000 | 341 |
| 16 | Гвоздодер | шт | 1,000 | 33 100 |
| 17 | Гибкий вал | шт | 2,000 | 451 678 |
| 18 | Гибкий вал б\у | шт | 1,000 | 271 900 |
| 19 | Гигрометр ВИТ-1 | шт | 1,000 | 15 762 |
| 20 | Горизонталь | шт | 20,000 | 309 818 |
| 21 | Двутавр | шт | 529,000 | 2 431 |
| 22 | Дрель аккумуляторная | шт | 1,000 | 482 950 |
| 23 | Завертка оконная | шт | 543,000 | 8 423 |
| 24 | Заготовка из листа | шт | 11,000 | 97 416 |
| 25 | Заготовка из трубы | шт | 2,000 | 33 962 |
| 26 | Заготовка оцинков. | кг | 256,200 | 36 107 |
| 27 | Задвижка б/у | шт | 2,000 | 93 616 |
| 28 | Задвижка накладная | шт | 25,000 | 21 228 |
| 29 | Задвижка чугунная | шт | 2,000 | 321 497 |
| 30 | Заземляющий элемент | шт | 1,000 | 15 732 |
| 31 | Закладные детали | шт | 3,000 | 60 030 |
| 33 | Заклепочник | шт | 1,000 | 97 147 |
| 34 | Закрепа | шт | 620,000 | 45 245 |
| 35 | Защелка ЗЩ | шт | 10,000 | 137 743 |
| 36 | Звонок электрический | шт | 1,000 | 27 431 |
| 37 | Змейка | шт | 1,000 | 17 940 |
| 38 | Знаки дорожные | шт | 17,000 | 789 121 |
| 39 | Калькулятор | шт | 4,000 | 205 272 |
| 40 | Калькулятор нераб. | шт | 5,000 | 72 028 |
| 41 | Калькулятор-1 | шт | 3,000 | 316 901 |
| 42 | Каска строительная | шт | 2,000 | 11 100 |
| 43 | Каска строительная | шт | 5,000 | 100 571 |
| 44 | Кельма для г\силикатных блоков | шт | 2,000 | 261 650 |
| 45 | Кельма кам. 200 мм | шт | 1,000 | 15 632 |
| 46 | Кельма трапецевидная | шт | 2,000 | 32 506 |
| 47 | Колонки для компьютера | шт | 2,000 | 43 956 |
| 48 | Колонны | м³ | 3,020 | 28 259 |
| 49 | Корпус решетки ливнестока | шт | 1,000 | 43 213 |
| 50 | Краги | шт | 6,000 | 56 419 |
| 51 | Кронштейн для умывальника | шт | 8,000 | 53 107 |
| 52 | Кронштейн коричневый | шт | 17,000 | 54 203 |
| 53 | Крючок для вязки арматуры | шт | 1,000 | 420 000 |
| 54 | Кусачики боковые | шт | 1,000 | 26 562 |
| 55 | Лом | шт | 2,000 | 41 813 |
| 56 | Лопата | шт | 6,000 | 63 869 |
| 57 | Лопата для очистки снега | шт | 1,000 | 33 576 |
| 58 | Лотки ж/б | м3 | 3,470 | 147 882 |
| 59 | Мегометр | шт | 1,000 | 3 492 |
| 60 | Микрометр | шт | 1,000 | 86 436 |
| 61 | Миксер малярный | шт | 1,000 | 35 498 |
| 62 | Молоток Сат. | шт | 1,000 | 137 340 |
| 63 | Молоток слесарный | шт | 4,000 | 56 398 |
| 64 | Набор инструментов | шт | 1,000 | 161 677 |
| 65 | Набор отвёрток | шт | 1,000 | 26 736 |
| 66 | Набор щупов | шт | 2,000 | 42 000 |
| 67 | Наволочка 70х70 | шт | 25,000 | 452 400 |
| 68 | Напильник | шт | 2,000 | 40 331 |
| 69 | Одеяло п\шерстяное | шт | 3,000 | 271 796 |
| 70 | Одеяло п\шерстяное 09с-3 | шт | 1,000 | 66 510 |
| 71 | Опора | шт | 10,000 | 1 943 |
| 72 | Опорная пята | шт | 10,000 | 54 996 |
| 73 | Отбойный молоток | шт | 1,000 | 430 170 |
| 74 | Отвертка | шт | 7,000 | 66 587 |
| 75 | Отвес строительный | шт | 8,000 | 134 064 |
| 76 | Поддоны деревян. | шт | 2,000 | 192 979 |
| 77 | Патрон б\у | шт | 5,000 | 34 787 |
| 78 | Патрон керамический подвесной б\у | шт | 2,000 | 8 666 |
| 79 | Перемычки б\у | м³ | 1,945 | 5 301 739 |
| 80 | Перемычки г/силикатные | м³ | 0,075 | 173 551 |
| 81 | Перемычки ж/б | м³ | 1,000 | 3 156 392 |
| 82 | Переноска | шт | 2,000 | 104 530 |
| 83 | Переноска А | шт | 2,000 | 81 506 |
| 84 | Переноска д. 10 | шт | 2,000 | 142 447 |
| 85 | Перчатки диэлектрические | пар | 1,000 | 103 |
| 86 | Перчатки диэлектрические | пар | 2,000 | 27 906 |
| 87 | Перчатки резиновые | пар | 3,000 | 25 200 |
| 88 | Петли форточные | шт | 19,000 | 113 |
| 89 | Петля | шт | 2,000 | 1 385 |
| 90 | Петля накладная ПН1-110 | шт | 4,000 | 49 998 |
| 91 | Петля оконная | шт | 26,000 | 25 294 |
| 92 | Петля ПН-130 | шт | 63,000 | 300 809 |
| 93 | Петля рояль | шт | 27,000 | 565 |
| 94 | Пила лобзиковая электрическая | шт | 1,000 | 564 000 |
| 95 | Пила ручная электрич. | шт | 1,000 | 774 000 |
| 96 | Пистолет д\герметиков | шт | 1,000 | 28 499 |
| 97 | Плотнометр | шт | 1,000 | 282 000 |
| 98 | Плита ж\б б\у | м³ | 7,200 | 3 840 000 |
| 99 | Плита ПП20-2 | шт | 1,000 | 477 372 |
| 100 | Плитка бетонная тротуарная | м² | 6,660 | 328 996 |
| 101 | Плиты ПТ 12,5*8 | шт | 1,000 | 53 220 |
| 102 | Плоскогубцы | шт | 5,000 | 148 258 |
| 103 | Поддоны Радош. | шт | 51,000 | 3 672 000 |
| 104 | Поддоны 1030х1030 | шт | 28,000 | 2 571 120 |
| 105 | Поддоны ЗСМ | шт | 1,000 | 113 838 |
| 106 | Поддоны ДОЗ | шт | 2,000 | 229 872 |
| 107 | Поддоны П2-2,4 930х1230 | шт | 5,000 | 472 660 |
| 108 | Подмости | шт | 2,000 | 210 |
| 109 | Подушка 58,х58 | шт | 4,000 | 100 642 |
| 110 | Подушка ж/б | м3 | 10,570 | 4 540 553 |
| 111 | Подушка пост. | шт | 3,000 | 69 156 |
| 112 | Подушки 68х68 | шт | 3,000 | 113 494 |
| 113 | Подшлемник | шт | 15,000 | 149 446 |
| 114 | Покрывало | шт | 2,000 | 64 291 |
| 115 | Полоса | кг | 175,820 | 1 610 293 |
| 116 | Полотенцесушитель | шт | 4,000 | 545 630 |
| 117 | Полотнище с рукавицами | шт | 2,000 | 126 720 |
| 118 | ПП10-2 | шт | 1,000 | 129 216 |
| 119 | Проволока | кг | 326,400 | 1 219 350 |
| 120 | Простынь 1,5м | шт | 40,000 | 1 044 000 |
| 121 | Профиль потолочный ПЛ 60-27 | пог. м | 162,000 | 1 073 088 |
| 122 | Профлист | м² | 1,740 | 28 655 |
| 123 | Пылесос | шт | 1,000 | 176 650 |
| 124 | Радиаторы | шт | 27,000 | 767 597 |
| 125 | Радиаторы 2К60П | шт | 14,000 | 1 442 582 |
| 126 | Резьба | шт | 7,000 | 8 334 |
| 127 | Релле | шт | 1,000 | 14 104 |
| 128 | Ремень стяжной | шт | 1,000 | 107 772 |
| 129 | Решетка ливнестока | шт | 1,000 | 37 727 |
| 130 | Ригель дверной | шт | 2,000 | 16 000 |
| 131 | Розетка потолочная | шт | 8,000 | 13 502 |
| 132 | Розетка РА 10-214 б\у | шт | 6,000 | 95 996 |
| 133 | Розетка РА 16-263 б\у | шт | 2,000 | 68 800 |
| 134 | Розетка РА16-255 б\у | шт | 7,000 | 73 500 |
| 135 | Розетка РС16 б\у | шт | 2,000 | 31 400 |
| 136 | Рулетка 7,5м | шт | 1,000 | 57 997 |
| 137 | Сайдинг внутренний | шт | 1,000 | 9 700 |
| 138 | Связь диогональная | шт | 6,000 | 175 872 |
| 139 | Сетка-рабица б\у | м² | 18,000 | 294 396 |
| 140 | Стол | шт | 26,000 | 140 717 |
| 141 | Стул | шт | 1,000 | 142 241 |
| 142 | Стулья | шт | 40,000 | 4 365 022 |
| 143 | Тачка | шт | 2,000 | 1 045 958 |
| 144 | Телефонный аппарат | шт | 3,000 | 143 593 |
| 145 | Тёрка пенопласт | шт | 11,000 | 226 180 |
| 146 | Тёрка пенопласт | шт | 6,000 | 209 795 |
| 147 | Термометр ПТП | шт | 1,000 | 22 499 |
| 148 | Термометр ТБП | шт | 1,000 | 43 200 |
| 149 | Удлиннитель 10.9 | шт | 2,000 | 311 800 |
| 150 | Форма для плитки, 50*50 | шт | 2,000 | 357 600 |
| 151 | Форма забора | шт | 4,000 | 2 467 356 |
| 152 | Форма куба | шт | 2,000 | 348 000 |
| 153 | Шкаф | шт | 11,000 | 8 990 |
| 154 | Щебень фр.5-20 | м³ | 10,820 | 1 261 124 |
| 155 | Щебень фр.20-40 | м³ | 2,090 | 367 417 |
| 156 | Эл. плита 3-комф. | шт | 1,000 | 1 155 647 |
| 157 | Эл. рубанок | шт | 1,000 | 530 400 |
| 158 | Эл. рубанок | шт | 1,000 | 735 000 |
| 159 | Ящик для инструмента | шт | 1,000 | 70 997 |
| 160 | Ящик для инструмента б\у | шт | 1,000 | 81 600 |
| 161 | Трансформатор сварочный | шт | 1,000 | 4 680 000 |
| 162 | Трансформатор | шт | 1,000 | 842 880 |
| 163 | Трансформатор | шт | 1,000 | 1 208 892 |
| 164 | Трансформатор б\у | шт | 2,000 | 215 164 |

**Торги в виде аукциона состоятся 1 апреля 2016 года в 12.00 по адресу: г. Мядель, ул. Интернациональная, д. 4 (по месту нахождения имущества). Ознакомиться с предметом торгов можно по месту его нахождения, предварительно согласовав дату и время с организатором торгов.**

**Шаг аукциона – 5 процентов.**

**Продавец – ДУП «ПМК-215» УП «Минскоблсельстрой» (тел.: (017) 268-54-52).**

**Организатор торгов – ООО «Партнёр-Консультант» (220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1118-10, тел.: (017) 268-54-52 (Анастасия).**

Прием заявок начинается с момента выхода объявления, осуществляется по месту нахождения организатора торгов и прекращается за три дня до начала торгов. Задаток вносится до подачи заявления на участие в торгах в размере 10 процентов от начальной цены предмета торгов (с НДС) на р/с 3012452420020 в Филиале ОАО «Белагропромбанк» Минское областное управление, код 942, УНП 690019233, получатель – ДУП «ПМК-215» УП «Минскоблсельстрой», назначение платежа: задаток за предмет торгов.

При признании торгов несостоявшимися в связи с наличием заявления на участие в них только от одного участника, возможна продажа предмета торгов этому участнику по цене, увеличенной на 5 процентов.

К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме с учетом НДС 20% не позднее 5 рабочих дней с даты подписания договора купли-продажи.

Аляксандра ПРЫВАЛАВА:

# «ТЭНІС ДАЎ МНЕ ЗНАЧНА БОЛЬШ, ЧЫМ Я ЯМУ»

## Пінг-понг — спорт або гульня розуму?

**Першыя поспехі беларускага настольнага тэніса пачалі з'яўляцца ў сярэдзіне 90-х — тады па ўсім свеце загучала імя Уладзіміра Самсонава. Праз дзесяцігоддзі гэты ўсплёск падхапілі сёстры Паўловіч, а ўслед за імі з'явілася маладая «зорачка» Аляксандра Прывалава. У 19 гадоў яна стала бронзавай прызёркай чэмпіянату свету ў складзе зборнай Беларусі, паступова дабаўляла ў свой актыў узнагароды буйных еўрапейскіх спаборніцтваў, а потым і зусім сенсацыйна прабілася на Алімпійскія гульні ў Лондане. Сёння Аляксандра — ужо чатырохразовая пераможца чэмпіянату краіны, але, здаецца, свайго галоўнага слова ў тэнісе яна яшчэ не сказала. Напярэдадні адказных стартаў — чэмпіянату свету і кваліфікацыі да Алімпійскіх гульняў 2016-га — спартсменка расказала пра асаблівасці настольнага тэніса, падзялілася разважаннямі пра феномен кітайскіх спартсменаў і крыху расказала пра сябе.**



### ПРА ТЫТУЛ, ЯКІ СКАРЫЎСЯ ЁЙ УЖО ЧАЦВЁРТЫ РАЗ

— Сёлета я стала пераможцай чэмпіянату Беларусі, але пра тое, што гэта здарылася са мной чацвёрты раз, нават не ведала, мне сказалі пазней. На гэтым турніры заўсёды ёсць з кім пазмагацца і чаму навучыцца. На сёлетнім чэмпіянаце самым складаным для мяне, вядома, стаў фінал, дзе наша маладая спартсменка Дар'я Трыгалас навязала вельмі сур'ёзную барацьбу. З ёй рэдка бываюць лёгкія сустрэчы, таму цяжкі матч для мяне не стаў нечаканасцю і ў выніку ўсё склалася на маю карысць.

Вядома, цяпер ад заваявання тытула чэмпіёнкі краіны няма столькі эмоцый, як гэта было ў першы раз, але чэмпіянат Беларусі — найважнейшы рэспубліканскі старт, таму я заўсёды стараюся выступіць на ім добра.

### ПРА НАСТОЛЬНЫ ТЭНІС У БЕЛАРУСІ

*Нягледзячы на даступнасць пінг-понга ў матэрыяльным плане і поспехі беларускіх спартсменаў на міжнародных спаборніцтвах, настольны тэніс сёння ў краіне не такі ўжо і папулярны. Хоць і раней дзяцей у секцыі прыводзілі са школы, куды прыходзілі трэнеры з кубкамі і медалямі, каб прыцягнуць увагу патэнцыйных вучняў.*

**«Каб зразумець настольны тэніс, у яго трэба пагуляць».**

— Я трапіла ў спорт менавіта так. Не думала тады, што тэніс стане сур'ёзным заняткам, але трэніравацца мне падабалася. Сёння я ў спорце ўжо 18 гадоў. Мы знаходзімся цяпер у пераходным перыядзе, у зборнай ідзе змена пакаленняў. Там як вопытная Віка Паўловіч, так і зусім маладзенькія дзяўчаты, я дзесьці ў сярэдзіне. Такая нізкая папулярнасць тэніса ў нашай краіне мне незразумела, бо гэта вельмі цікавы і відовішчны спорт. Можа, збоку не заўсёды відаць, і, каб зразумець настольны тэніс, у яго трэба пагуляць. Туды ўключаны і галава, і фізіка, і каардынацыя, неад'емная частка — хуткасць, сіла і рэакцыя, хоць з боку ён выглядае вельмі лёгка.

### ПРА САКРЭТЫ СУСВЕТНЫХ ЛІДАРАЎ

*Кажучы пра сучасны пінг-понг, нельга не закрануць тэму татальнага дамінавання ў гэтым спорце кітайскіх спартсменаў, асабліва ў святле таго, што ў апошнія дзесяцігоддзі іх актыўна натуралізуюць іншыя краіны.*

— Раней гэта дакладна быў спорт нумар адзін у Паднябеснай, але цяпер там актыўна развіваецца бадмінтон, ды і ў іншых відах яны прыкметна прагрэсуюць. Тое, што ідзе такая актыўная натуралізацыя, — дадае пэўных складанасцяў у выступленні на міжнароднай арэне. Разам з тым і гуляць з імі цікава, гэта магчымасць патрэніравацца і прывыкнуць, перш чым сустрэцца з асноўнымі сапернікамі — спартсменамі нацыянальнай зборнай Кітая. Я была б рада, каб у Беларусь запрасілі спецыяліста для павышэння кваліфікацыі трэнэраў або кітайскіх спартсменаў для спарынгаў з намі, ці, наадварот, беларускіх тэнісістаў часцей адпраўлялі на зборы ў Кітай. Упэўнена, гэта прынесла б пэўную карысць.

*Пару гадоў таму Аляксандра прымала ўдзел у падобным зборы, арганізаваным кітайскім бокам, з чаго вынесла вялікую карысць і можа падзяліцца некаторымі асаблівасцямі падрыхтоўкі.*

— Я невялікая спецыялістка ў кітайскай сістэме, але тое, што ўбачыла там, — абсалютна іншае стаўленне спартсменаў да трэніровак, іншае разуменне тэніса. Яны працуюць над рэчамі, пра якія мы часам нават не ведаем. Плюс іх велізарная працаздольнасць: яны трэніруюцца нашмат больш. У падрыхтоўку спартсменаў да 15 гадоў уключана вялікая колькасць трэніровачных гадзін, чым старэйшым ты становішся, чым вышэйшы ўзровень, тым больш увагі надаецца дэталям, якія на нізкім узроўні не істотныя. Кітайцы вялікі акцэнт робяць на тэарытычнай пабудове гульні, для іх важна акрэсліць структуру матча.

### ПРА САМАЕ ВАЖНАЕ НА КОРЦЕ

*У гэтым, збоку простым, відзе спорту шмат нюансаў, якія не відаць воку заўзятара, але якія з'яўляюцца сур'ёзным аргументам на пляцоўцы. Напрыклад, дрэва, з якога зроблена ракетка, і накладка паверх яго. Наяўнасць на ракетцы шыпоў і іх памер наўпрост уплывае на палёт мяча, яго рух і хуткасць. Аднак галоўным складнікам поспеху, адзначае Аляксандра, з'яўляецца псіхалагічная гатоўнасць спартсмена.*

— Важна паставіць тэхніку, навучыцца трымаць мяч на стале, надаваць яму кручэнне, але не менш важная тактыка-псіхалагічная праца. Часам выходзіш супраць саперніка, за якога ты, безумоўна, больш моцны тэхнічна, але ён за кошт галавы, нейкіх тактычных момантаў перайграе цябе, і ты проста не разумееш, што здарылася. Тэнісіст выходзіць у квадрат фактычна «голым»: думкі, якія яго бянтэжаць, адцягваюць, комплексы — гэта ўсё адлюстроўваецца ў канкрэтным прайграным мячы.

### ПРА ПЛАНЫ

*Цяпер нашы майстры «малой ракеткі» выступаюць на камандным чэмпіянаце свету, пазней іх чакае адборачны турнір на Алімпійскія гульні ў Бразілію, які пройдзе ў пачатку красавіка.*

— Сёння знаходжуся ў добрай форме, прагрэсірую. Не ведаю, ці дазволіць здароўе выкласціся ў поўнай меры: ёсць пэўныя праблемы, але не хочацца акцэнтаваць на іх увагу.

*Сёлета спартсмены ў настольным тэнісе будуць адбірацца на Алімпіяду па іншай схеме. Раней наймацнейшыя тэнісісты згодна з сусветным рэйтынгам траплялі на Гульні наўпрост, а астатнія дабіраліся праз спецыяльны кваліфікацыйны турнір. Гэтым разам для ўсіх будуць арганізаваны адборачныя спаборніцтвы.*

**«Тэнісіст выходзіць у квадрат фактычна «голым».**

— У гэтым ёсць вялікая складанасць, таму, што тыя спартсмены, якія і так маглі б паводле рэйтынгу трапіць у Рыа, будуць змагацца за пуцёўкі і забіраць іх у тэнісістаў, узроўнем ніжэйшых. Таму трапіць на Алімпіяду ў гэтым годзе будзе вельмі складана.

*На Гульнях Аляксандра ўжо была (чатыры гады таму), але поспеху там не дабілася, таму дзяўчына не лічыць гэта сваім дасягненнем.*

— Адбор да Алімпіяды-2012 стаў для мяне вельмі запамінальнай падзеяй. Тады ніхто, ды і сама я, не чакаў, што праб'юся ў Лондан, але на Алімпійскія гульні трэба ехаць, каб заваёўваць узнагароды, а не проста паглядзець на новую для сябе краіну.

### ПРА СВОЙ ВЫБАР І ЖЫЦЦЁ

*У спорце Аляксандра ўжо каля 18 гадоў і да сваёй галоўнай справы ставіцца па-філасофску. Ну а за межамі корта ёй уласцівы простыя чалавечыя радасці.*

— Люблю кіно, музыку, гумар, сустрэчы з сябрамі, чытаю кнігі па самаўдасканаленні, гісторыі поспеху вялікіх людзей і карпарацый. Не лічу, што з-за спорту ахвярую чымсьці; вядома, не паспяваю быць у курсе ўсіх спраў паўсядзённага жыцця, але гэта акупляецца з лішкам. Тэніс даў мне значна больш, чым я яму.

Мой галоўны фанат сёння — гэта брат Сяргей, яму таксама падабаецца настольны тэніс (у дзяцінстве мы любілі гуляць разам). Аднойчы ён смяецца з мяне і сказаў: «Уяўляю, Аляксандра Прывалава — чэмпіёнка Беларусі». Калі першы раз у кар'еры я выйграла гэты тытул, адразу прыгадала яго словы, патэлефанавала і паведаміла прыемную навіну. І да гэтага часу ён сочыць за ўсімі маімі выступленнямі.

## Бліц-навіны

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» распавядаем пра перамогу Надзеі Скардзіны на кантынентальным першынстве, чарговы тытул Максіма Мірнага і выступленні беларускіх гандбольных клубаў на міжнародных турнірах.**

# НАША НАДЗЕЯ ЕЎРОПУ БЯРЭ

***1. Надзея Скардзіна выйграла гонку праследавання і стала чэмпіёнкай Еўропы.*** Турнір праходзіў у Цюмені, наша спартсменка выйшла на дыстанцыю з адставаннем ад лідара немкі Надзін Хорхлер на 38 секунд. Аднак прайшла тры агнявыя рубяжы без промахаў і забяспечыла сабе камфортную перавагу ў 43 секунды. На заключнай стральбе стоячы Надзея зарабіла два штрафныя кругі, але гэта не перашкодзіла беларусцы заваяваць залатую медаль.

**Прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Надзею Скардзіну з заваяваннем узнагароды. «Гэтую перамогу з нецярпеннем чакалі шматлікія балельшчыкі каманды Беларусі па біятлоне. Спадзяюся, што твой поспех надасць нашым спартсменам упэўненасці ў сваіх сілах перад стартамі чэмпіянату свету», — адзначаецца ў віншаванні. Аляксандр Лукашэнка пажадаў спартсменцы, а таксама яе калегам па камандзе, трэнерскаму штабу здароўя, удачы і новых перамог.**

Гэтая ўзнагарода стала адзінай у скарбонцы беларускай зборнай на сёлетнім чэмпіянаце Еўропы. Адзначым, што кантынентальнае першынство для многіх біятланістаў стала кантрольным стартам перад чэмпіянатам свету, які пройдзе ў нарвежскім Халменколене з 3 па 13 сакавіка.

***2. Максім Мірны і Трэт Х'юі сталі пераможцамі парнага разраду на турніры ў мексіканскім Акапулька (прызавы фонд — $1,4 млн).*** У фінальным матчы беларуска-філіпінскі тандэм сустракаўся з аўстрыйска-нямецкім дуэтам Аляксандр Пея/Філіп Петцшнэр і перамог у двух сэтах — 7:6 (7:5), 6:3. Гэта першы сумесны поспех Мірнага і Х'юі на падобных турнірах.

Адзначым, што за спартыўную кар'еру Максім Мірны 92 разы выступаў у фіналах парных турніраў пад эгідай АТП, 49 паядынкаў скончыліся перамогай пары, у складзе якой быў беларус.

***3. Гандбалісты мінскага СКА ў гасцявой сустрэчы Кубка ЕГФ саступілі дацкаму «Б'ерынгбро» 26:32 і цяпер займаюць трэцюю пазіцыю ў групе «С».*** Наперадзе ў армейцаў яшчэ тры сустрэчы: 6 сакавіка яны згуляюць матч у адказ з «Б'ерынгбро», 20 сакавіка адправяцца ў госці да швейцарскага «Вінтэртура», а 27-га сустрэнуцца з французскім «Сэн-Рафаэлем». Нагадаем, дзве лепшыя каманды групы выходзяць у наступны этап розыгрышу кубка.

Тым часам, Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова ў першым матчы накаўт-раўнда Лігі чэмпіёнаў згуляў унічыю з дацкім «Ск'ернам» 31:31. Паядынак у адказ пройдзе ў Брэсце 5 сакавіка.

# ПЕРАМАГАЦЬ У ПАВЕТРЫ І НА ЗЯМЛІ

**Два медалі і пахвала гасцей — такі вынік мы атрымалі ад чэмпіянату свету па фрыстайле ў Раўбічах**



**Двое выхадных запар Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па зімніх відах спорту прымаў спаборніцтвы сусветнага ўзроўню. Услед за этапам Кубка свету па фрыстайле ў Раўбічах прайшоў юніёрскі чэмпіянат. За галоўныя прызы турніру змагаліся 30 лыжных акрабатаў з 7 краін свету, Беларусь была прадстаўлена максімальным лікам удзельнікаў — 8 спартсменаў.**

Наша краіна вызначылася не толькі колькасцю, але і якасцю: Аляксандра Раманоўская па суме двух скачкоў змагла апярэдзіць галоўных канкурэнтак — расіянак — і выйграла залаты медаль. Годам раней Аляксандра ўжо станавілася чэмпіёнкай свету сярод юніёрак, а тыдзень таму беларуска была ўдастоена бронзавай узнагароды на даросльм этапе Кубка свету. Не падвялі і нашы хлопцы: Дзмітрый Мазуркевіч стаў сярэбраным прызёрам чэмпіянату, лепш за яго выступіў толькі расіянін Максім Бураў.

Добрым вынікам вызначыліся не толькі беларускія спартсмены, але і арганізатары спаборніцтваў. Гэта адзначыў **спартыўны дырэктар лыжнага саюза Беларусі Канстанцін ГРЫБАЎ:**

*— Арганізацыя абодвух турніраў па фрыстайле ў Раўбічах прайшла на высокім узроўні, гэта падкрэслілі замежныя госці. Рэйс-дырэктар спаборніцтваў выказаў вялікую ўдзячнасць за якасць правядзення турніру і многія спадарожныя моманты. Парадавалі і заўзятары, якія, нягледзячы на халоднае надвор'е, дабраліся да месца спаборніцтваў і горача падтрымлівалі нашых спартсменаў. FIS пацвердзіў давер да якасці правядзення міжнародных стартаў па фрыстайле ў Беларусі, таму мы плануем правядзіць этап Кубка свету штогод.*

Адзначым, што наступныя старты беларускіх лыжных акрабатаў адбудуцца ў сакавіку ў Швейцарыі, дзе пройдуць тры этапы Кубка Еўропы.

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
lobazhevich@zviazda.by

■ А вы ведалі?

# Газета «Звязда» ў айчыннай філуменіі




**Тых, хто займаецца калекцыяніраваннем запалкавых этыкетак ці пачкаў ад запалак, называюць філуменістамі, а калекцыяніраванне этыкетак з пачкаў ад запалак, запалкавых пачкаў, буклетаў (кніжак-запалак) і іншых прадметаў, звязаных з запалкамі, называецца філуменіяй (ад грэчаскага «phileo» — люблю і лацінскага «lumen» — агонь ці святло).**

Сёння філуменія не з'яўляецца распаўсюджаным хобі, як, напрыклад, калекцыяніраванне манет, паштовых марак, паштовак, самавараў, прасаў, але аматары гэтай навукі працягваюць развіваць сваю калекцыю. Між іншым, кошт на запалкавыя этыкеткі і запалкі XIX—XX стагоддзяў ніколькі не ніжэйшы чым, напрыклад, на банкноты ці манеты гэтага перыяду.













Але не пра гэта сёння размова, а... пра газету «Звязда» на запалкавых этыкетках беларускіх прадпрыемстваў.

Згадка пра «Звязду» ўпершыню з'явілася на запалкавых этыкетках у 1959 годзе. Тады Барысаўскі фанерна-запалкавы камбінат выпусціў запалкі з этыкеткай-заклікам (на рускай мове), каб людзі выпісвалі і куплялі газеты і часопісы. Побач з тэкстам была намалявана паштальёнка з сумкай газет, у якой на першым плане вылучалася газета «Звязда».

Праз два гады — у 1961-м — той жа Барысаўскі фанерна-запалкавы камбінат выпускае серыю этыкетак на запалках (на беларускай мове) з рознымі малюнкамі і тэкстамі: «Чытайце «Звязду», пішыце ў яе»; «Распаўсюджвайце «Звязду»; «Выпісвайце «Звязду»; «Чытайце «Звязду».

У 1997 годзе, да 80-годдзя газеты, прадпрыемства «Пінскдрэў» адгукнулася на гэты слаўны юбілей і выпусціла запалкі з тэкстам «Беларускай газеце ЗВЯЗДА 80».

Вось, бадай, і ўсё, што датычыць газеты «Звязда» ў беларускай філуменіі. Але наперадзе 100-гадовы юбілей выдання. Будзем спадзявацца, што ён не застанецца незаўважаным.

**Сяргей ЧЫГРЫН**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.57 | 18.47 | 10.50 |
| Віцебск — | 7.49 | 18.35 | 10.46 |
| Магілёў — | 7.48 | 18.37 | 10.49 |
| Гомель — | 7.42 | 18.36 | 10.54 |
| Гродна — | 8.12 | 19.03 | 10.51 |
| Брэст — | 8.10 | 19.05 | 10.55 |

**Месяц**

*Поўня 22.02 — 01.03.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

**Імяніны**

**Пр.** *Данілы, Ілы, Паўла, Самуіла.*
**К.** *Антаніны, Фелікса.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

«Даваць — браць». У народнай культуры лічылі, што з перадачай рэчаў можна перадаць (аддаць) і адпаведна атрымаць і іншыя даброты (дабрабыт, «спор» гаспадаркі, поспех, шчасце сям'і). Таму ў нормах побытавага этыкету і павodзін нашага народа існаваў шэраг правілаў, якіх неабходна было прытрымлівацца, калі вы пазычаеце, дорыце ці атрымліваеце тыя ці іншыя рэчы, грошы і г.д.

◈ Нельга было нічога аддаваць з дому ў вялікія народныя ці царкоўныя святы, пасля захаду сонца, на пачатку і пасля заканчэння сельскагаспадарчых работ. Лічылася, што ў адваротным выпадку ў гаспадароў перастане весціся свойская жывёла, узнікнуць непрыемнасці, адным словам — як сядае за небасхіл, «сыходзіць» сонца, так «сыйдзе» з хаты і дабрабыт, і шчасце.

◈ Самая строгая забарона на вынас чагосьці з хаты накладаецца на перыяд святкавання Калядаў і асноўных святочных дзён: Раства Хрыстова (Першая куцця), Новага года (Другая куцця) і Вадохрышча (Трэцяя куцця), інакш поспех і дабрабыт «адвернецца» ад гэтай хаты на ўвесь год.

◈ Каб не жыць з адвечнай пазыкай і ў нястачы, неабходна было напярэдадні Новага года абавязкова вярнуць усе пазыкі.

◈ Таксама асаблівым значэннем надзялялі той перыяд часу, калі пачыналіся сельскагаспадарчыя работы: калі ў час ворыва ці сяўбы з хаты што-небудзь аддаць ці пазычыць камусьці, ураджай і рост раслін адыдзе да таго, хто браў тыя ці іншыя рэчы.

◈ Ніколі не аддавалі штосьці ці не пазычалі ў той дзень, калі з дому ад'язджаў хто-небудзь са сваякоў. Лічылася, што выкананне гэтай забароны будзе спрыяць добраму шляху і вяртанню дадому таго, хто знаходзіўся ў вандроўцы.

◈ Першыя тры дні пасля нараджэння дзіцяці надзяляліся асаблівай сакральнасцю. Лічылася, што калі ў гэтыя дні штосьці пазычыць ці аддаць з хаты, то дзіця «будзе цурацца роднай хаты», г.зн. будзе вандроўнікам ці «перакаці-полем», а можа нават стаць рабаўніком.

◈ Ніколі не пазычалі што-небудзь у панядзелак. Лічылася, што ў такім выпадку ўвесь тыдзень «пойдзе прахам».

**Даты | Падзеі | Людзі**

### 1 САКАВІКА

**1566** год — 450 гадоў таму ўведзены ў дзеянне другі Статут Вялікага Княства Літоўскага — збор законаў феадальнага права, помнік беларускага пісьменства і юрыдычнай думкі.

**1921** год — (1—18 сакавіка) адбылося ўзброенае выступленне гарнізона Кранштата і экіпажаў некаторых караблёў Балтыйскага флоту (Кранштацкае паўстанне). Паўстанцы вылучылі лозунгі: «Саветы — без камуністаў!», «Улада Саветам, а не партыям!». Незадаволеныя палітыкай «ваеннага камунізму», яны запатрабавалі правядзення перавыбараў Саветаў і выгнання з іх бальшавікоў, прадастаўлення свабоды слова, сходаў і саюзаў усім партыям, вызвалення з-за кратаў членаў сацыялістычных партый, забеспячэння свабоды гандлю, дазволу сялянам свабодна карыстацца зямлёй і распараджацца прадуктамі сваёй гаспадаркі, г. зн. ліквідацыі харчразвёрсткі. Забастоўкамі і дэманстрацыямі кранштатцаў падтрымалі рабочыя Петраграда. ЦК РКП(б) і ўрад на чале з Леніным прынялі экстранныя меры для ліквідацыі паўстання. У Петраградзе было ўведзена асаднае становішча, паўстанцаў абвясцілі мяцежнікамі, з імі адмовіліся весці перамовы. Палкі Чырвонай Арміі, узмоцненыя атрадамі ВЧК і дэлегатамі X з'езда РКП(б), якія спецыяльна прыбылі з Масквы, штурмам узялі Кранштат. Больш як тысяча матросаў было забіта, каля дзвюх з паловай тысяч арыштавана, каля 8 тысяч эмігравала ў Фінляндыю. Кранштацкае паўстанне разам з выступленнямі рабочых і сялян у іншых раёнах краіны сведчыла аб глыбокім эканамічным і сацыяльным крызісе, правале палітыкі «ваеннага камунізму». Бальшавікам стала зразумела, што для вышывання ўлады неабходна ўвядзенне новага ўнутрыпалітычнага курсу, нацэленага на задавальненне патрабаванняў асноўнай масы насельніцтва — сялянства. Гэты курс увайшоў у гісторыю пад назвай новая эканамічная палітыка — нэп.



**1926** год — 90 гадоў таму нарадзіўся (вёска Хутар Быхаўскага раёна) Барыс Васілевіч Стральцоў, беларускі пісьменнік, публіцыст, доктар філалагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. У 1956 годзе скончыў БДУ. Працаваў у газетах «Чырвоная змена», «Звязда», у БДУ. Аўтар рамана «Між крутых берагоў», зборнікаў апавяданняў, аповесцяў «Вячэрняя планета», «Метраном памяці» і інш. Напісаў сцэнарыі да дакументальных фільмаў «Рэпартаж аднаго дня», «Зразуменне таямніцы» і інш. Памёр у 2009 годзе.

**Было сказана**

**Пімен ПАНЧАНКА, народны паэт Беларусі:**

*І ў сцюжу нечай ласкай ты сагрэты,*
*І ў спёку пекане цябе зіма.*

## УСМІХНЕМСЯ

«Я ведаю, дзе ты», — такая sms ад жонкі адразу змяняе ўсе планы на вечар.

**У кожнай жанчыны павінна быць маленькая чорная сукенка. У мяне таксама ёсць чорная сукенка, якая мне маленькая.**

Перапіска ў інтэрнэце.
— Апішы сябе.
— Косці, мяса, пяць літраў крыві і вясёлыя, задорныя вочы.

**Вырашылі з жонкай пачаць усё наноў.**

**Дык яна нават на спатканне не прыйшла.**

— Я чую, ты развёўся. Як перажыў?
— Цяпер нарэшце супакоіўся, а спачатку думаў, што розум ад радасці страчу!

**Нечаканы ўдар малатком па пальцы з'яўляецца тэстам для тэлевізійнага вядучага ці карэспандэнта. У залежнасці ад таго, што ён скажа, вызначаецца, гатовы ён працаваць у прамым эфіры ці не.**




Малюнак Міколы ГІРГЕЛЯ.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.108. Індэкс 63850. Зак. № 823.

Нумар падпісаны ў 19.30 29 лютага 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12